Голас Радзімы

№ 11 (1324) САКАВІК 1974 г. ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ ГОД ВЫДАННЯ 19-ТЫ ЦАНА 2 КАП.

САЮЗ ПРАЦЫ І МАСТАЦТВА

У канцы мінулага года ў Брэсцкі абласны драматычны тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі прыйшла ўрадавая тэлеграма: сакратар ВЦСПС Л. Зямляннікава і міністр культуры СССР Е. Фурцава віншавалі калектыў з прысуджэннем яму пераходнага Чырвонага сцяга ВЦСПС і Міністэрства культуры СССР за лепшую ў краіне культурна-шэфскую работу на вёсцы. Адзначаўся толькі адзін бок дзейнасці тэатра, але вельмі характэрны для нашай рэчаіснасці — цесная сувязь паміж творчым калектывам і людзьмі працы.

За апошнія два гады Брэсцкі тэатр паказаў у калгасах і саўгасах вобласці больш за 300 спектакляў. Амаль 100 тысяч сельскіх жыхароў убачылі лепшыя работы тэатра. Перад сельскімі гледачамі выступалі акцёры і рэжысёры тэатра, якія расказвалі аб сваёй рабоце, аб творчых планах. Пасля спектакляў наладжвалася іх абмеркаванне.

Ва ўсе часы дзейнасць тэатра вымяралася не касавым зборам, а тымі ідэаламі дабра і справядлівасці, што нёс ён гледачам, не выбраннікам-тэатралам, а шырокай публіцы. У Брэсцкага тэатра сапраўды народная аўдыторыя, якую ён беражліва выхоўвае. І не выпадкова на Брэстчыне ў апошняе дзесяцігоддзе ўзнікла шмат аматарскіх драматычных калектываў. Іх таксама падтрымлівае і накіроўвае абласны тэатр, пры якім створаны кансультацыйны савет, дзе кіраўнікі самадзейных калектываў атрымліваюць парады па рэжысуры, афармленні спектакляў.

У мінулым годзе каля 150 спектакляў паказаў у калгасах і саўгасах Міншчыны Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача. Артыст тэатра А. Каляда і рэжысёр Л. Тарасава — шэфы самадзейных драматычных калектываў у Івянцы і Вілейцы. За дасягненні ў культурна-шэфскай рабоце тэатр узнагароджаны вымпелам Міністэрства культуры СССР.

Частыя і жаданыя госці на вёсцы і артысты старэйшага беларускага тэатральнага калектыву — Дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа. Са сваімі спектаклямі яны пабывалі ў дзесятках калгасаў і саўгасаў Віцебшчыны. Даўняя дружба звязвае коласаўцаў з хлебаробамі калгаса імя Леніна. У калгасным доме культуры ішлі амаль усе спектаклі тэатра. Свае выступленні на яго сцэне віцебскія артысты лічаць адказнай творчай справаздачай, бо прыхільны сельскі глядач з кожным годам робіцца ўсё больш патрабавальным.

У коласаўцаў таксама трывалыя шэфскія сувязі з самадзейнымі драматычнымі калектывамі. Так, настаўнікам і дарадцам Багушэўскага народнага тэатра доўгі час быў народны артыст БССР Ц. Сяргейчык. Цяпер шэфства ўзяў заслужаны артыст рэспублікі Г. Дубаў.

Творчая дапамога вядомых майстроў сцэны самадзейным тэатрам, студыям, гурткам мае ў нашай рэспубліцы глыбокія карэнні. Пачыналі гэтую высакародную справу такія выдатныя беларускія артысты і рэжысёры, як У. Уладамірскі, К. Саннікаў, Г. Глебаў, Д. Арлоў, А. Ільінскі, А. Мазалеўская. На самадзейнай сцэне разам з аматарамі выступалі Б. Платонаў (у ролі Заслонава ў спектаклі народнага тэатра аршанскіх чыгуначнікаў), В. Пола і Г. Глебаў (у «Паўлінцы», пастаўленай Ашмянскім народным тэатрам). Сёння сваімі творчымі поспехамі народны тэатр Палаца культуры Мінскага аўтазавода ў многім абавязаны народнаму артысту СССР З. Стоме, а багаты сцэнічны вопыт народнага артыста СССР П. Малчанава прынёс вялікую карысць народнаму тэатру трактаразаводцаў.

Трэба адзначыць, што гэтая карысць узаемная. Прыходзячы ў самадзейныя калектывы, выступаючы на сцэнах сельскіх і рабочых дамоў культуры, прафесійныя рэжысёры і акцёры самі творча ўзбагачаюцца, пазнаюць жыццё людзей працы. Ці не ў добрым веданні сучаснай вёскі, яе сённяшніх праблем сакрэт поспеху спектакля «Таблетку пад язык» па п'есе А. Макаёнка ў Дзяржаўным драматычным тэатры імя Коласа? І напэўна добрае сяброўства з вялікім рабочым калектывам Мінскага камвольнага камбіната дапамагло Рускаму драматычнаму тэатру імя Горкага стварыць актуальны і востры спектакль «Чалавек з боку» па п'есе І. Дварэцкага.

Мы па-ранейшаму гаворым: тэатр шэфствуе.., артысты-шэфы... і г. д., а жыццё ўносіць ужо карэктывы ў саму з'яву шэфства. Не толькі тэатр аказвае дапамогу заводу, калгасу, але і сам з удзячнасцю прымае іх парады і падтрымку. Нарадзілася садружнасць, жыццёва неабходная і творчым, і працоўным калектывам.

Дагавор аб такой садружнасці заключаны паміж Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатрам оперы і балета БССР і Мінскім аўтазаводам.

Абавязацельствы, прадугледжаныя дагаворам, выконваюцца, як кажуць, на вышэйшым узроўні. На сцэне палаца культуры аўтазаводцаў, у цэхах у час абедзеннага перапынку выступаюць вядучыя салісты тэатра, у заводскім народным універсітэце чытаюць лекцыі рэжысёры, мастакі, дырыжоры, у тым ліку і галоўны рэжысёр тэатра А. Дадзішкіляні. Выконваюць свае абавязкі і аўтазаводцы.

Мінскі аўтазавод і калгас імя Гастэлы Мінскага раёна, з якім тэатр таксама падпісаў дагавор аб сацыялістычнай садружнасці, устанавілі па дзве штогадовыя прэміі для маладых творчых работнікаў за дасягнутыя поспехі ў мастацкім майстэрстве і стварэнні ў оперных і балетных спектаклях яркіх сцэнічных вобразаў. Імёны першых лаўрэатаў стануць вядомы 27 сакавіка—у Міжнародны дзень тэатра.

Дагавор аб сацыялістычнай садружнасці заключаны і паміж Гомельскім абласным драматычным тэатрам і «Гомсельмашам». На сустрэчах абодвух калектываў артысты знаёмяць гомсельмашаўцаў з новымі работамі, дзеляцца творчымі планамі; рабочыя завода расказваюць пра свае працоўныя справы, выказваюць меркаванні аб прагледжаных спектаклях. Гэтыя сустрэчы — адзін з прыкладаў плённай садружнасці працы і мастацтва, саюза, які грунтуецца на агульных мэтах людзей працы і прадстаўнікоў мастацтва.

У час абедзеннага перапынку перад трактаразаводцамі выступае заслужаная артыстка БССР Вольга ШУТАВА.

Фота У. ЛУПЕЙКІ.

нататкі каментатара

БЯЗМЕЖНАЯ НІВА ДРУЖБЫ

«Адкажыце, калі ласка, а маляваць кветкі вам дазваляюць?»

Гэтае пытанне савецкія мастакі пачулі на поўдні Італіі, дзе дэманстравалася выстаўка беларускага жывапісу, арганізаваная Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі. Першабытнасць і недасведчанасць такога пытання можна дараваць, калі ўлічыць, што тыя, хто задаваў яго, мелі самыя добрыя намеры і ўпершыню бачылі «жывога савецкага».

Пачуўшы пра гэты эпізод з выступлення дэлегата Трэцяй рэспубліканскай канферэнцыі Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, мастака У. Стэльмашонка, я адразу ж падумаў: якія неабсяжныя межы той нівы, якую мы ўзорваем дзеля буйных усходаў дружбы і лепшага ўзаемаразумення паміж намі і іншымі народамі, і як многа яшчэ дрымучых аблогаў.

Нашаму чытачу гэты маленькі прыклад, магчыма, дапаможа глыбей зразумець вялікае палітычнае значэнне такой масавай арганізацыі, якой з'яўляецца Беларускае таварыства дружбы. Яго аддзяленні дзейнічаюць на заводах і ў школах, у калгасах і саўгасах, у навуковых установах і інстытутах. Яго функцыянеры — прафесар і хлебароб, мастак і інжынер, пісьменнік і рабочы, камсамольскі работнік і вясковы настаўнік. За сваю працу на карысць дружбы і трывалага міру яны не атрымліваюць якіх-небудзь матэрыяльных узнагарод. Пабуджальнікам іх дзейнасці з'яўляецца сумленне і добрая воля. Яны ясна ўсведамляюць сваю высакародную місію — актыўна садзейнічаць развіццю дружалюбных адносін савецкага народа з народамі зарубежных краін, даваць людзям, аслепленым тэндэнцыйнай буржуазнай прапагандай, праўдзівую інфармацыю аб дасягненнях рэальнага сацыялізму, растлумачваць прынцыпы міралюбівай знешняй палітыкі Краіны Саветаў.

Ніва, на якой рупна працуюць аб'яднаныя ў Беларускім таварыстве дружбы 11 рэспубліканскіх, 36 абласных, гарадскіх і раённых і 129 мясцовых аддзяленняў савецкіх таварыстваў дружбы з зарубежнымі краінамі, дае добры плён. Гэтаму цяпер спрыяе актыўная, мэтанакіраваная знешнепалітычная дзейнасць нашай партыі, якая распрацавала на сваім XXIV з'ездзе Праграму міру, прынятую і ўхваленую ўсімі міралюбівымі сіламі свету.

Геаграфія сувязей Беларускага таварыства дружбы зараз даволі шырокая: яно падтрымлівае дружалюбныя кантакты з 312 арганізацыямі ў 63 краінах свету.

Савецкая кніжка, кінафільм, фотавыстаўка, грампласцінка дапамагаюць зарубежнай грамадскасці набываць пэўныя веды і ўяўленні аб Савецкім Саюзе. Лекцыя нашага вучонага за мяжой, выступленне мастацкага калектыву, сустрэчы з савецкімі людзьмі па той і гэты бок мяжы паглыбляюць гэты працэс пазнання і даюць магчымасць ужо больш грунтоўна меркаваць аб нашых дасягненнях, асаблівасцях савецкага ладу жыцця, перавагах нашай сацыяльнай сістэмы. Удзел у такіх міжнародных сустрэчах, як, напрыклад, сустрэча ў 1972 годзе ў Мінску пад дэвізам: «Няхай ніколі не паўторыцца трагедыя Хатыні, Лідзіцэ, Арадура, Хірасімы, Сангмі!» выхоўвае пачуццё інтэрнацыяналізму, яднае сілы ў барацьбе за мір.

Гэтым жа высакародным мэтам служыць і пабрацімства гарадоў. Нашы чытачы ўжо ведаюць, што сталіца Беларусі Мінск падтрымлівае дружалюбныя сувязі з англійскім горадам Ноцінгемам, японскім — Сэндаем і індыйскім Бангалурам. Нашы Магілёў, Орша, Жодзіна сябруюць з французскімі гарадамі Вілербанам, Во-зан-Вленам і Веніс'е.

Шырокі рэзананс у свеце атрымалі кампаніі салідарнасці савецкіх працоўных з народамі, якія змагаюцца за сваю свабоду і незалежнасць, супраць сіл імперыялізму — з в'етнамскім народам, народамі арабскіх краін, што сталі ахвярамі ізраільскай агрэсіі, чылійскім народам, які трапіў у ціскі фашысцкай дыктатуры, з іншымі народамі краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Беларускае таварыства дружбы будзіць грамадскую думку рэспублікі і прымае самы актыўны ўдзел у такіх кампаніях.

Вось чаму дзейнасць таварыства карыстаецца падтрымкай усіх слаёў нашай грамадскасці, вось чаму высокую ацэнку яго рабоце даў Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі. У прывітанні ЦК КПБ у адрас канферэнцыі адзначаецца, што Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, якое аб'ядноўвае многія тысячы прадстаўнікоў грамадскасці рэспублікі, уносіць свой уклад у справу ўмацавання дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі, ва ўсталяванне прынцыпаў мірнага суіснавання дзяржаў з розным сацыяльным ладам.

Сувязі Беларускага таварыства дружбы з зарубежнымі арганізацыямі штогод пашыраюцца. Мы набываем усё больш сяброў і дзелавых партнёраў, людзей, якія рэалістычна бачаць нашы дасягненні і магчымасці сацыялістычнага ладу. Сувязі гэтыя маюць двухбаковую накіраванасць. Мы імкнёмся, каб праўда пра нас, пра нашы мэты распаўсюджвалася ва ўсіх рэгіёнах планеты, каб усё менш станавілася людзей, якія, убачыўшы «жывога савецкага», стараліся памацаць яго, каб пераканацца, што гэта не сон і што мы такія ж людзі.

Але мы хочам таксама глыбей пазнаць таго, з кім наважыліся дружыць, рабіць супольна карысную справу. Бо сапраўды, нельга ж сябраваць з тым, каго не ведаеш.

Дружба — паняцце канкрэтнае, яна можа быць вартаснай толькі тады, калі напоўнена вялікім зместам. Узбагачаць гэты змест і зрабіць больш урадлівай ніву дружбы — да гэтага заклікала Трэцяя рэспубліканская канферэнцыя Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, якая адбылася на мінулым тыдні.

В. КРАСЛАЎСКІ.

У прадзільна-круцільным цэху Аршанскага льнокамбіната.

ТРАДЫЦЫЙНЫ І СУЧАСНЫ

Больш як чвэрць мільёна гектараў займаюць у Беларусі пасевы льну. Лён і тканіны з яго вядомы ў рэспубліцы з даўніх часоў. У народных беларускіх песнях і казках гаворыцца, што ён узяў свежасць у расы, чысціню — у сонца, прыгажосць— у мары закаханай дзяўчыны.

Льняное адзенне валодае такімі ўласцівасцямі, як лёгкасць і трываласць. Спецыялісты лічаць, што тканіны з «паўночнага шоўку» ўбіраюць і выпараюць вільгаць лепш, чым баваўняныя, шаўковыя і шарсцяныя, а тым больш тканіны з хімічных валокнаў. Паводле сцвярджэння медыкаў, лён папярэджвае ў некаторай ступені прастудныя захворванні.

Традыцыі беларускага льнянога ткацтва складаліся стагоддзямі. У вышыўках па льну паказаны кветкі лугоў і палёў, грацыя дзікіх жывёл і птушак, уяўленні вышывальшчыц аб прыгажосці навакольнага свету. Сёння багацейшыя традыцыі народнай творчасці ашчадна выкарыстоўваюць мастакі ў стварэнні новых узораў і мадэлей, а інжынеры — у прамысловай вытворчасці тканін і адзення.

Прамысловасць рэспублікі ўжо выпрацоўвае льняны трыкатаж самых розных структур. Гэтыя тканіны прыцягваюць рэзнастайнасцю расфарбоўкі і лічацца адной з самых прывабных навінак ільнянога ткацтва. Практычна невычарпальныя магчымасці адкрывае мастакам-мадэльерам ільняны трыкатаж з набіўкай, а таксама з нашыўкай або вышыўкай. Вырабы з такога трыкатажу прыгожыя і практычныя. Гэта можа быць і летняе паліто для людзей розных узростаў, і самы звышмодны пляжны касцюм.

Карыстаюцца попытам і традыцыйныя вырабы з ільну: бялізнавыя тканіны, абрусы, пакрывалы, ручнікі, дарожкі.

Старажытны лён «дружыць» з новымі валакністымі матэрыяламі, у тым ліку сінтэтычнымі. Дзякуючы гэтаму «паўночны шоўк» набывае лепшыя якасці сваіх спадарожнікаў—не каменяцца, не збягаецца пры мыцці і захоўвае адметную якасць — гігіенічнасць.

Цяпер прадукцыя льняной прамысловасці Беларусі разыходзіцца па 800 адрасах унутры краіны і за рубяжом.

Беларускія спецыялісты пастаянна ўдасканальваюць і павялічваюць вытворчасць ільновалакна, ствараючы ўсё новыя яго ўзоры, у тым ліку батыст— асаблівы від найтанчэйшых льняных тканін для адзення і бялізны.

Толькі адзін ільнокамбінат, размешчаны ў горадзе Оршы, выпускае ў дзень чвэрць мільёна метраў ільнянога палатна, больш як 60 назваў: сукенкавакасцюмнае, чыста льняное і з дабаўленнем лаўсану, парцьернае, прасціннае — белае ўпрыгожанае беларускім арнаментам. З поўным уводам новых магутнасцей на Аршанскім ільнокамбінаце прадпрыемства будзе даваць к канцу пяцігодкі да двух мільёнаў метраў тканіны ў год.

А. ПЁТУХ.

ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ

На Баранавіцкім заводзе гандлёвага машынабудавання пачаўся серыйны выпуск халадзільных шафаў ШХ-0,56. Яны прызначаюцца для прадпрыемстваў харчовай прамысловасці краіны. Да канца года намечана выпусціць 10 тысяч такіх агрэгатаў. НА ЗДЫМКУ: кантралёр Ірына ГРЫГОР'ЕВА, спесары Георгій КАРДАШ і Анатоль ТРЫБУХОЎСКІ правяраюць работу халадзільных шафаў на выпрабавальным стэндзе.

Фота Э. КАБЯКА.

НОВЫ ЭТАП У ДАСЛЕДАВАННІ КОСМАСУ

Аўтаматычныя міжпланетныя станцыі «Марс-6» і «Марс-7» дасягнулі наваколляў планеты Марс адпаведна 12 і 9 сакавіка 1974 года. Спускаемы апарат аўтаматычнай станцыі «Марс-6» зрабіў 12 сакавіка пасадку на паверхню планеты. Упершыню былі перададзены на Зямлю навуковыя даныя аб параметрах марсіянскай атмасферы, атрыманыя прамымі вымярэннямі ў час зніжэння спускаемага апарата.

Аўтаматычныя станцыі «Марс-6» і «Марс-7» былі выведзены на міжпланетную трасу ў жніўні мінулага года. У час палёту са станцыямі рэгулярна праводзіліся сеансы сувязі, у ходзе якіх ажыццяўляліся траекторныя вымярэнні, кантроль стану бартавых сістэм, карэкцыі траекторый руху і перадача на Зямлю навуковай інфармацыі аб фізічных характарыстыках касмічнай прасторы.

Новыя навуковыя вынікі, атрыманыя ў палёце савецкімі аўтаматычнымі станцыямі «Марс-4», «Марс-5», «Марс-6» і «Марс-7», якія працягнулі даследаванні, пачатыя станцыямі «Марс-2» і «Марс-3», расшыраюць звесткі аб прыродзе Марса і ўносяць значны ўклад у развіццё сучаснай планеталогіі.

ДОМ АДПАЧЫНКУ КАЛГАСНІКА

У Беларускім навукова-даследчым і праектным інстытуце па будаўніцтву ў вёсцы распрацаван тэхнічны праект эксперыментальнага дома адпачынку калгасніка на сто месц.

Спальны корпус дома адпачынку зблакіраван з памяшканнямі клуба і сталовай. Пакоі ў спальным корпусе разлічаны на двух чалавек.

Праект дома адпачынку калгасніка распрацаван у майстэрні эксперыментальнага і тыпавога праектавання жылых і грамадзянскіх будынкаў інстытута. Аўтары праекта — архітэктар М. Нядзелька і інжынер Г. Бусловіч.

СТВОРАН ФАКУЛЬТЭТ

У Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі адкрыт яшчэ адзін факультэт — па рабоце з замежнымі студэнтамі. Яго мэта — дапамагчы замежным студэнтам авалодаць перадавой сельскагаспадарчай навукай. Факультэт будзе падтрымліваць цесныя кантакты з маладымі спецыялістамі, якія закончылі вучобу. Ім штогод будзе высылацца навейшая літаратура па той спецыяльнасці, якую яны атрымалі ў акадэміі.

Цяпер у акадэміі стацыянарна і завочна навучаецца каля дзесяці тысяч студэнтаў. Пачынаючы з 1963 года разам з савецкімі юнакамі і дзяўчатамі вышэйшую сельскагаспадарчую адукацыю атрымлівае і моладзь з многіх краін Еўропы, Азіі і Афрыкі — з 24 дзяржаў свету. Маладыя спецыялісты Далхасурангійн Дашдэндэў з МНР і Юсэф Сулейман Іса з Сірыі закончылі тут аспірантуру і абаранілі дысертацыі.

ПАЛАТНО СА ШКЛА

На асіповіцкім шклозаводзе «Кастрычнік» пачалося будаўніцтва першай у Беларусі вытворчасці па выпуску шклопалатна. Гэты самы трывалы матэрыял будзе выкарыстоўвацца для ізаляцыі дрэнажных труб на меліярацыйных трасах і выпрацоўкі новага дахавага крыцця — шклорубероіда. Праектная магутнасць будучага цэха — дваццаць мільёнаў квадратных метраў прадукцыі ў год. Асноўным яе спажыўцом стане Асіповіцкі кардоннарубероідны завод.

Усе вытворчыя працэсы ў новым цэху будуць механізаваны і аўтаматызаваны. У 1976 годзе яго намечана здаць у эксплуатацыю.

ПРАЦУЮЦЬ ШВЕЙНІКІ

Партыю прыгожых мужчынскіх сарочак з новага віду нейлонавай тканіны адправілі гандлёвым прадпрыемствам швейнікі Мінскага вытворчага аб'яднання імя Крупскай. Гэта адна з навінак вясенне-летняга асартыменту, асвоеная швейнікамі да будучага сезона.

Буйнейшае аб'яднанне, на долю якога прыпадае чвэрць прадукцыі, што выпускаецца галіной, напалову абнаўляе асартымент. Толькі ў першым паўгоддзі будзе асвоена больш як 60 відаў новых вырабаў.

Прадпрыемствы Міністэрства лёгкай прамысловасці рэспублікі запусцяць у вытворчасць у першым паўгоддзі звыш 500 новых мадэлей адзення.

ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ

Акадэміі навук СССР — 250 год

8 ЛЮТАГА 1724 года, з'явіўся ўказ Пятра I аб заснаванні Акадэміі навук, якая ёсць «собрание ученых и искусных людей, которые ... сии науки совершить и умножить тщатся». Пры акадэміі стваравуся і універсітэт з той мэтай, каб навукі хутчэй «в народе расплодились». Цікавая лічба: на ажыццяўленне праекта было выдаткавана... 24 912 рублёў.

З першых год свайго існавання Расійская акадэмія заявіла аб сабе, як аб самастойным саюзе вучоных, які ўражваў сучаснікаў разнастайнасцю і глыбінёй даследаванняў. Першае акадэмічнае выданне «Каментарыі» адразу ж пасля выхаду ў свет заваявала сусветную вядомасць.

Немагчыма пералічыць імёны вучоных акадэміі, якія назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю сусветнай навукі і тэхнікі. Яны вывучалі сваю краіну, яе прыродныя багацці і мову, стваралі новую тэхніку і выхоўвалі кадры для навукі, адкрывалі новыя навучальныя ўстановы і навуковыя напрамкі. Але акадэмія заставалася, па выказванню А. Луначарскага, «пустэльніцай самадзяржаўя».

Пасля Кастрычніка акадэмія перажыла сваё другое нараджэнне. Вучоныя ўбачылі перад сабой ясныя перспектывы. Калі ў пачатку стагоддзя Расія мела ўсяго пяць навуковых лабараторый, то ў хуткім часе пасля рэвалюцыі было створана больш як 50 даследчых цэнтраў.

Цяпер у складзе АН СССР 250 навуковых арганізацый. У іх заняты звыш 40 тысяч навуковых супрацоўнікаў. АН СССР з'яўляецца членам 140 міжнародных арганізацый, а каля 900 савецкіх вучоных выбраны членамі зарубежных акадэмій і навуковых таварыстваў.

Юбілей АН СССР адзначаюць усе нацыянальныя акадэміі. Так, у гонар гэтай даты ў галоўным корпусе АН БССР адкрылася пастаянна дзеючая выстаўка. На ёй прадстаўлена каля 200 экспанатаў. У тым ліку славуты квантавы генератар «Вясёлка-4» і прыбор для сартавання сталей на металургічных прадпрыемствах — «ІМА-2А», камбінаваныя ратацыйныя фрэзы і макет універсальнай гама-ўстаноўкі, шасцерні з палімераў і цяжкія каласы пшаніцы, вырашчаныя з апрацаванага гама-праменнямі насення, дзеючая аўтаматычная сістэма праектавання рэжучага інструменту і жаўтаватая штучная глеба, якой вучоныя прадказваюць вялікае будучае ў век касмічных караблёў і арбітальных станцый.

Кожны экспанат — часцінка вялікай даследчай работы, якую праводзяць беларускія вучоныя ў розных галінах навукі і тэхнікі. Акрамя ўстановак і прыбораў, у экспазіцыі многа стэндаў і дыяграм, што расказваюць пра дасягненні інстытутаў і аддзелаў, шмат лічбаў— красамоўных, пераканаўчых. Вось толькі некаторыя з іх. У мінулым годзе вучонымі акадэміі атрымана 356 аўтарскіх пасведчанняў. Эканамічны эфект ад укаранення новаўвядзенняў у народную гаспадарку краіны склаў звыш 20 мільёнаў рублёў.

НА ЗДЫМКУ: у залах выстаўкі.

Фота А. НІКАЛАЕВА.

БЯРОЗА ЗАМЕСТ МЕТАЛУ

У Беларускім тэхналагічным інстытуце знойдзены спосаб апрацоўкі драўніны спецыяльнымі феноласпіртавымі смоламі, пасля чаго яна набывае вогнетрывалыя ўласцівасці.

На Мінскім трактарным заводзе мадыфікаваная драўніна больш года выкарыстоўвалася... як ліцейная аснастка. Бяроза, альха і іншыя ліставыя пароды пасля адпаведнай апрацоўкі набываюць высокую стабільнасць і выдатныя фізіка-механічныя ўласцівасці. Новыя мадэлі з драўніны выпрабоўваліся народні з алюмініевымі. Пасля 2 500 здымай форм яны знаходзяцца ў добрым стане, не маюць дэфектаў. Такі матэрыял можа з цягам часу стаць канкурэнтам алюмінію.

Пры прымяненні мадыфікаванай драўніны ў ліцейнай вытворчасці адпадае адзін абавязковы працэс — падрыхтоўка драўлянай прамадэлі, пасля якой звычайна робіцца алюмініевая. Выпрабаванні паказалі, што новая аснастка асабліва добра сябе зарэкамендавала для форм малых размераў.

На Гродзенскім хімкамбінаце па распрацоўках інстытута манціруецца ўстаноўка для мадыфікацыі элементаў градзірань з дрэва. Звычайна абсталяванне градзірань, без якіх не могуць абыходзіцца многія прадпрыемствы, нават калі яно з жалезабетону, не вытрымлівае працяглага часу службы. Вучоныя ўстанавілі, што апрацаваная феноласпіртамі драўніна прадоўжыць тэрмін службы больш чым у чатыры разы.

НАРАДЖЭННЕ НОВАГА ЛАЗЕРА

НОВЫ ТЫП ЛАЗЕРА НА ПАРАХ СКЛАДАНЫХ АРГАНІЧНЫХ МАЛЕКУЛ СТВОРАН У ІНСТЫТУЦЕ ФІЗІКІ АКАДЭМІІ НАВУК БССР, У ЛАБАРАТОРЫІ ЧЛЕНА-КАРЭСПАНДЭНТА АН СССР М. БАРЫСЕВІЧА. ПАСПЯХОВА ВЫРАШАНА ПРАБЛЕМА, НАД ЯКОЙ ДОЎГІЯ ГАДЫ ПРАЦАВАЛІ ВУЧОНЫЯ МНОГІХ КРАІН СВЕТУ. КАМЕНЦІРУЕ ГЭТУЮ ПАДЗЕЮ ЧЛЕН-КАРЭСПАНДЭНТ АН СССР, ДОКТАР ФІЗІКА-МАТЭМАТЫЧНЫХ НАВУК Л. КІСЯЛЕЎСКІ.

— Першы лазер пабудаван больш як дзесяць гадоў таму назад. Яго актыўным целам, або, як гавораць фізікі, рабочым рэчывам, быў рубінавы крышталь. Адкрыццё чарадзейнага промня стала пачаткам новай галіны навукі — квантавай электронікі. Але ўжо тады захапленні наконт нараджэння рубінавага лазера не засланілі ад спецыялістаў яго недахопы. Усе ўбачылі, што ён, падобна камертону, які выдае толькі адзіны гук, здольны выпраменьваць пучок святла толькі адной даўжыні хвалі. Атрыманне стацыянарнай генерацыі было спалучана ў ім з вялікімі цяжкасцямі. Гэта абмяжоўвала сферу прымянення лазера, зніжала яго эфектыўнасць.

У хуткім часе з'явіліся газавыя лазеры, якія здольны працаваць на адной або некалькіх частотах і могуць лёгка генерыраваць у няспынным рэжыме. Гэта іх якасць значна расшырыла сферы выкарыстання лазераў — яны ўкараніліся ў сувязі, галаграфіі, геадэзіі. Аднак і гэты тып квантавых генератараў не пазбаўлен недахопаў — ім па-ранейшаму не хапае спектральнай шырыні.

Нарэшце, былі створаны лазеры на растворах складаных злучэнняў, часцей за ўсё называемых фарбавальнікамі. За гэтую работу вучоныя Інстытута фізікі — Сцяпанаў, Рубінаў і Мастоўнікаў — былі ўдастоены Дзяржаўнай прэміі СССР за 1972 год.

Калі рубінавы лазер нагадвае нам камертон, то квантавы генератар на фарбавальніках хутчэй за ўсё падобны на музычны інструмент — яго можна настроіць на любую светлавую «мелодыю», атрымаць імпульсы рознай даўжыні хвалі. Прычым, працягласць выпраменьвання хістаецца ад міліярдных долей секунды да няспыннай генерацыі. І ўсё ж фізікі незадаволены: вадкае актыўнае асяроддзе неаднароднае па аптычных уласцівасцях, дае вялікую разыходжанасць промня, што перашкаджае перадачы яго на значныя адлегласці.

Лазер на парах свабодны ад шэрагу недахопаў, уласцівых яго папярэднікам. Гэтак жа, як і лазер на фарбавальніках, ён можа працаваць у імпульсным і няспынным рэжыме. Прычым стацыянарны рэжым генерацыі дасягаецца ў ім лягчэй за кошт павелічэння скорасці змены актыўнага рэчыва шляхам яго інтэнсіўнай пракачкі.

Сёння рана яшчэ гаварыць аб усіх перавагах лазера на парах — яны пакуль што не вывучаны. Але аўтары новаўвядзення — член-карэспандэнт АН СССР Барысевіч, яго маладыя калегі Талкачоў і Калоша — спадзяюцца, што далейшая работа над удасканаленнем лазера адкрые новыя яго магчымасці, што будуць значна палепшаны характарыстыкі квантавых генератараў наогул, расшырана сфера іх выкарыстання.

Стварэнне новага лазера — заканамерны вынік тых вялікіх даследаванняў, якія праводзяцца ў гэтай галіне беларускімі вучонымі. Інстытут фізікі АН БССР не раз пацвярджаў рэпутацыю аднаго з асноўных навуковых цэнтраў Савецкага Саюза ў галіне спектраскапіі, люмінесценцыі і квантавай электронікі.

І МІКРОБЫ КАРЫСНЫЯ

МІКРОБЫ сапраўды паўсюдныя, яны знаходзяцца ў паветры, у ільдах Арктыкі і Антарктыкі, у гарачых азёрах, на горных хрыбтах, у марской бездані. Непатрабавальныя невідзімкі здольныя жыць і размнажацца пры тэмпературы ад 2 градусаў марозу да 70 градусаў гарачыні. Дзеліцца гэта клетка так бурна, што за 36 гадзін з яе адной можа атрымацца маса ў 4 000 тон. Калі б не мікробы, наша планета даўно ператварылася б у могілкі—трупы жывёлін, птушак, адмершыя расліны пакрылі б усю паверхню зямлі і запоўнілі б моры.

Мікроб, як і ўсякае жывое цела, будуе сябе з ежы. Спецыяльна падбіраючы харчовыя рэчывы, можна стварацъ умовы, якія прымушаюць мікробы развівацца ў патрэбным чалавеку напрамку, уплываць на іх спадчыннасць. Іменна такім шляхам былі створаны многія вакцыны для прафілактычных прышчэпак.

Некаторыя драбнейшыя істоты, што знаходзяцца ў глебе, здольныя стварацъ рэчывы, якія змяншаюць рост іншых мікробаў або нават забіваюць іх. Вучоныя выкарысталі і гэту асаблівасць для стварэння такіх лекавых прэпаратаў, як антыбіётыкі—пеніцылін, тэтрацыклін і інш.

Вось і атрымліваецца, што тыя самыя мікробы, да якіх мы прывыклі адносіцца як да ворагаў здароўя, на самай справе могуць аказваць людзям велізарную дапамогу ў барацьбе з інфекцыямі. Спіс іх карысных уласцівасцей гэтым, аднак, не вычэрпваецца. У мікробаў няма, як вядома, спецыяльных органаў для прыёму ежы, яны засвойваюць у гатовым выглядзе пажыўныя рэчывы з навакольнага асяроддзя. Асобныя з драбнейшых выдзяляюць ферменты, якія ператвараюць адно рэчыва ў другое. Гэта аказалася вельмі выгаднай справай. Напрыклад, каб хімічным шляхам раскласці каалін на састаўныя часткі, неабходна тэмпература ў 1000 градусаў, мікробам жа дастаткова для гэтага 10—15 градусаў. У металургічнай практыцы зарэкамендаваў сябе спосаб вышчалочвання каляровых металаў з бедных руд. Медзь, атрыманая такім чынам, каштуе амаль у тры разы танней. Такім жа чынам можна атрымліваць цынк, нікель, кобальт, уран.

Мікробы лёгка расшчапляюць сваімі ферментамі арганічныя рэчывы і пераводзяць іх у мінеральныя. Пры гэтым папаўняюцца запасы вуглекіслаты ў атмасферы, і яе вуглярод могуць засвойваць зялёныя расліны. Наогул, невідзімкі актыўна ўдзельнічаюць у кругазвароце вугляроду і азоту ў прыродзе, а без гэтых рэчываў немагчыма стварэнне бялкоў.

Вялікі спіс фізіялагічна актыўных рэчываў, якія атрымліваюцца сёння ў прамысловых маштабах, дзякуючы бактэрыям. Складанейшыя па сваёй хімічнай структуры арганічныя злучэнні ствараюцца з іх дапамогай з больш простых рэчываў. Бакінская, майкопская і цюменская нафта, гаручыя сланцы Эстоніі, жалезныя руды Крывароржжа і Карэліі, торф Беларусі, фасфаты Казахстана і многія, многія іншыя прыродныя багацці не што іншае, як «спадчыннасць» мікробаў.

Выключная іх роля ў сельскай гаспадарцы. Вялікі ўплыў на ўраджайнасць глебы аказвае азот. Невычарпальныя запасы гэтага газу ў паветры. Некаторыя расліны засвойваюць азот проста з атмасферы з дапамогай асобных бактэрый.

Мікробы дапамагаюць умацоўваць і кармавую базу жывёлагадоўлі. Дастаткова, напрыклад, дадаць да сіласнай масы невялікую колькасць (усяго дзесятыя долі працэнта) плеснявых грыбкоў, і яе пажыўныя якасці значна паляпшаюцца, у два-тры разы ўзрастае ўтрыманне цукру.

Сыр, кефір, кумыс, іншыя віды малочнакіслых прадуктаў — таксама вынік работы бактэрый. На малочнакіслым браджэнні заснавана прыгатаванне квашанай капусты, агуркоў, яблык, памідораў.

Расказ аб карыснай жыццядзейнасці мікраарганізмаў можна было б прадоўжыць, але і без таго відавочна іх значэнне для народнай гаспадаркі і медыцыны. Жыццё такім чынам пацвярджае глыбокую навуковую абгрунтаванасць вывадаў, зробленых ў Дырэктывах XXIV з'езда КПСС: **«Паскоранымі тэмпамі развіваць мікрабіялагічную прамысловасць».** У дзевятай пяцігодцы ў СССР будуюцца буйныя заводы для вытворчасці бялкова-вітамінных канцэнтратаў з вадкіх парафінаў нафты і інш. Узвядзенне некалькіх такіх буйных прадпрыемстваў прадугледжана, у прыватнасці, у Беларускай ССР, у раёнах Наваполацка і Рэчыцы, дзе разгорнута шырокая здабыча і перапрацоўка нафты.

І. БАЦЮК,
кандыдат медыцынскіх навук.

ШТОГОД БЕЛАРУСКІЯ НАЦЫЯНАЛІСТЫ АДЗНАЧАЮЦЬ ТАК ЗВАНЫЯ «ЎГОДКІ 25 САКАВІКА». АБ ТЫМ, ЯКІЯ ПАЧУЦЦІ ВЫКЛІКАЮЦЬ ГЭТА «СВЯТА» І ЎСЯ «ВЫЗВОЛЬНАЯ» ВАЛТУЗНЯ СЯРОД ПРАГРЭСІЎНЫХ БЕЛАРУСАЎ ЗА МЯЖОЙ, СВЕДЧАЦЬ НАСТУПНЫЯ ПІСЬМЫ НАШЫХ АМЕРЫКАНСКАГА І АЎСТРАЛІЙСКАГА ЗЕМЛЯКОЎ, ДАСЛАНЫЯ Ў «ГОЛАС РАДЗІМЫ».

СПАДАРЫ САБРАЛІСЯ НА «ЎГОДКІ»

КОЖНЫ год беларускія нацыяналісты на экзылі святкуюць «угодкі 25 сакавіка». Што ж гэта за дата? 25 сакавіка 1918 года сабралася ў Мінску контррэвалюцыйная зграя пад кіраўніцтвам буйнога абшарніка Скірмунта і выступіла супраць Савецкай улады, аб'явіўшы «незалежнасць» Беларусі. Скірмунту і кампаніі хацелася, каб беларускі селянін і надалей быў панскім нявольнікам. Апекуном у іх быў нямецкі кайзер Вільгельм, а таму яны за такую ласку пакорліва цалавалі яму руку.

Рэвалюцыйны народ вымеў і немцаў, і іх халуёў з беларускай зямлі. Вось чаму кожны год у дзень 25 сакавіка здраднікі плачуць аб тым, што не ўдалося надзець ярмо на плечы беларускага народа.

Пры спатканні з Гебельсам Антону не пашанцавала — не сфатаграфаваліся разам, а вось з Розенбергам дык атрымалася проста цудоўна: на фота Антось з Розенбергам стаяць, як родныя браты. Вы разумееце, што ў той час значыла паказаць такое фота якому-небудзь эсэсаўцу. Той адразу выкідваў правую руку і крычаў, колькі сілы ставала: «Хайль Гітлер!»

Антон, такім чынам, быў аўтарытэтны сярод сваіх паплечнікаў, гэткіх, як Акінчыц, Казлоўскі, Іваноўскі, Ермачэнка, Гадлеўскі. Дык вось хто такі стары смаркаты дзядок Адамовіч. Таму не каму-небудзь іншаму, а менавіта яму даверяюць правясці «ўгодкі 25 сакавіка».

«Угодкі» адбываюцца, прыкладна, так.

...Нью-Йорк. Перад адкрыццём «урачыстай акадэміі» спадары ідуць у царкву памаліцца. Пасля багаслужэння на зборышчы выступае з прамовай Антон Адамовіч. На ганаровых месцах сядзяць: паэтка Наталля Арсеннева з азыдлым тварам — тая, што ў час акупацыі Беларусі гітлераўцамі спявала: «Каб не праспаць світання»; «дохтар» Вітаўт Тумаш, былы бургамістр Мінска; «дохтар» Янка Станкевіч, «вучоны» і перакладчык біблії на беларускую мову; яшчэ адзін «дохтар», Стась Станкевіч, які вельмі па-майстэрску ў Барысаве вырываў залатыя зубы ў закатаваных фашыстамі яўрэяў.

Антон Адамовіч узнімаецца на трыбуну, высморкваецца ў насоўку, і ў прысутных з'яўляецца пачуццё агіды. Не адна маладая спадарыня, седзячы і пазіраючы на Антона, думае: «Божухна мой! І навошта выпхнулі на паказ такога старога, гарбатага, смаркатага дзеда? Няўжо няма маладзейшых, на каго б прыемней было зірнуць?» Маладзейшых, аднак, няма і быць не можа.

Гэта Антон у Мінску крычаў на «акадэміях»: «Пад кіраўніцтвам вялікага фюрэра нямецкага народа Адольфа Гітлера мы, беларусы, сёння будуем новую Еўропу без жыдоў і камуністаў. Хто супраць нас, той мусіць згінуць!»

«Урачыстую акадэмію» прамоўца пачынае такімі словамі: «Ушануем, паважаныя спадары і спадарыні, палеглых і адышоўшых навечна на экзылі за вольную незалежную Бацькаўшчыну — прэзыдэнта Беларускай народнай рэспублікі, вечнай памяці Міколу Абрамчыка, Францішка Кушаля, епіскапа Тамошчыка... Прашу, паважаныя спадары і спадарыні, падняцца і ўшанаваць хвілінай маўчання...»

Пятрок Дубіна не слухае, што пляце Адамовіч: трыццаць год слухаеш тое самае, абрыдла.

Пятрок Дубіна, пакуль Антон меле і смаркаецца, адыходзіць у думках у далёкае мінулае. У яго памяці прабягаюць руіны Мінска, памяшканне гарадскога тэатра, дзе адбываўся так званы другі кангрэс.

Гэта было 27 і 28 чэрвеня 1944 года. Набралася на сцэне брахуноў — не злічыць. Адзін перад адным навыперадкі балбаталі ўвесь дзень. Немцы напрыганялі і слухачоў — дэлегатаў, каб гладзей праходзіла камедыя.

28 чэрвеня прачыталі пастанову кангрэса: «Аб'яўляем на ўвесь свет Беларусь самастойнай незалежнай краінай, бо да прыходу немцаў Беларусь была калоніяй чырвонай Масквы. Парываем з Масквою! Мы гаспадары сваёй зямлі... Няхай жыве будаўнік новай Еўропы Адольф Гітлер!»

Прамоўцы выступалі толькі да абеду. Кангрэс не паспеў скончыцца. Дэлегаты ў зале трывожна пачалі шушукацца: з Бабруйска ў Мінск паліцаі папрыбягалі ў споднікі.

Зала захвалявалася. Прыціхлі прамоўцы. Чырвоная Армія ідзе на Мінск. Праз хвілін пяць зала апусцела. Пятрок Дубіна выбег на вуліцу. Нямецкія танкі рухаюцца праз горад на захад. Значыць, немцы ўцякаюць з горада. Тут і пачалося. Уцякай, ратуйся, як хто можа! Пастанова кангрэса выскачыла з галоў і дэлегатаў, і прамоўцаў. Праз пяць хвілін хто зачапіўся за нямецкую машыну, хто ўціснуўся гвалтам з крыкам і лаянкай у адыходзячы на захад цягнік, іншы паспеў запрэгчы каня ў калёсы, а большасць на ўласных нагах давала драла ў напрамку «вялікага рэйха». Стась Станкевіч, напрыклад, ляцеў праз Баранавічы на Слонім у кузаве трохтонкі, стоячы і трымаючыся за плечы айца Гарошкі, які пазней пачаў выдаваць часопіс «Божым шляхам»... Дэлегаты разбегліся, як мышы з тонучага карабля.

Пятрок Дубіна сядзіць у зале, а ў думках бачыць, як беглі нямецкія паслугачы на захад і ён разам з імі. Абрыдла яму экзыль. Цяжка сказаць, ці доўга Дубіна перабірае ў памяці ўспаміны, як раптам даносіцца знаёмае слова: «Жыве!»

Антон Адамовіч заканчвае сваю прамову так: «Вольны свет павінен перамагчы чырвоную Маскву. Мы верым у перамогу. Жыве Беларусь!..»

— Жыве! — падхопліваюць Наталля Арсеннева, Вітаўт Тумаш, Янка Станкевіч і Стась Станкевіч.

Зала магільна маўчыць.

Беларусь жыве і квітнее. Беларусь савецкая, сацыялістычная. Жыццё і росквіт Беларусі — нож у пячонкі беларускім экзыльным халуям. Яны хацелі б бачыць Беларусь калоніяй капіталу, калоніяй імперыялізму. І таму ныюць і скуголяць прадажныя душы, таму паўтараюць кожны год адну і тую абрыдлую песню пад назвай «угодкі».

Раман КУРБЫКА.

ЗША.

Ігнат БУЛАВАЦКІ

АПОШНЯЯ НАДЗЕЯ

(Ноч. Стары чалавек, з абвязанай мокрым ручніком галавою, варочаецца з боку на бок і енчыць).

Мазгі свідруе думка, нібы куля,
А боль такі — хоць ты на сцену лезь.
Як малатамі бухае у скроні,
Снапамі іскры сыплюцца з вачэй.
Здаецца, міг — і разарвецца чэрап,
І разляціцца ўдрызгі галава.
Глытаю я пілюлю за пілюляй —
Дарэмная надзея аспірын.
Таўку я лёд, кладу на уціральнік,
Нібы чалму, на галаўню кручу.
Ніякае ні кроплі дапамогі,
Крый госпадзі, вар'ятам можна стаць.
О, божа мой, за што такую кару
Смяротнаму на старасць ты паслаў!
Эх, рухнула апошняя надзея...
І дзень і ноч, як чорная туга,
У памяці балюча праплываюць.
Пакрылася смугой уся зямля.
Маліўся я. І як яшчэ маліўся!..
Малітвы сам Ягова сведкай быў.
Малітвы ўсе, як мёртваму прыпаркі.
Памілуй мя за неразумны бунт.
Ізраіль быў маёй апошняй зоркай,
І гэтай зоркі прыкры свет патух.
Надзею меў, што толькі сіяністы
У Мінск мяне на царства завязуць.
...О, родны Мінск! Народ стаіць на плошчы...
Падводзяць мне аж белага каня.
Я — на каня, а конскі хвост — трубою...
Дугою шыя. Гасіць капытамі
Мінулай славы бруку камяні.
Ва ўсіх людзей расхрыстаныя грудзі
І ліпавыя лапці на нагах.
Я выцягнуў з зашмальцаванай торбы
Такі ж свой бел-чырвона-белы сцяг.
Махнуў уверх — народ раве, як можа:
— Няхай жыве наш родны прэзідэнт!..
Махнуў уніз — упалі на калені,
Заціхла мора галасоў жывых.
Конь ног сваіх не чуе пад сабою,
А я не чую пад сабой каня —
Нібы мяне паветра падхапіла.
На крылах я над плошчай праляцеў...

Ды гэта толькі мараў летуценні
Былі ў маёй балючай галаве.
Згубіў рэальнасць грунту пад сабою
І патануў, як камень, у ваду.
А колькі я набузаваў паперы —
З усіх стараннуў выйшаў марны пшык.
Цяпер і жонка скоса паглядае,
Як, часам, конь лянівы з-пад дугі.
— Раіса! Каб ты апрутнела, ведзьма,
Кладзі хутчэй мне лёд на галаву!
Як малатамі бухае у скроні,
А боль такі — хоць ты на сцену лезь...

КВАКТУХІ

Вясною нясуць куры яйкі,
А потым на яйкі садзяцца.
Глядзіш — неўзабаве ля хаты
Забегалі ўжо кураняты.
Квактусе нясціся лянота —
Чарвей разграбае пад плотам.
На яйках сядзець неахвота,
А толькі да прыкрасці квокча.
Жанчына пад рэшата сілай
На яйкі яе пасадзіла.
Паветра крыламі аж секла —
Квактуха ляцела, як з пекла.
Хоць надта хрыпата — няўмела
Аднойчы і пеўнем запела.
Як курыца пеўнем спявае —
Бяда яе голаў чакае.
Снуе па задворках старая —
Квактанне сваё паўтарае.
Гарачку квактання парою
Зніжалі халоднай вадою.
Не курыца — вылюдак нейкі,
Дарэмныя ўсякія лекі.
Такія вар'яты — квактухі
Плануюць «вызвольныя рухі».

Квактухаў палітыка будзе —
Уласныя лапкі на блюдзе.

ТРУБАЧЫ

Чытачам каб дапячы —
Дзьмуць у трубы трубачы.
Дзікіх гукаў талака
Не зыходзіць з языка.

Сяргей ХМАРА:
Ту-ру-ру, ту-ру-ру,
Стась працуе ў ЦРУ.

Стась СТАНКЕВІЧ:
Га-га-га, га-га-га,
Хмара дурань — пустальга.

ЧЫТАЧ:
Дзве трубы — адна зараза,
На Радзіму брэшуць разам.
Каб не чуць, што пруць вар'яты,
Закладаю ў вушы ваты.

Аўстралія.

Канстанцыя БУЙЛО

ПРАДВЕСНЕ

Хоць зіма яшчэ злуецца
І марозіць сцюжай лютай —
Сонца радасней смяецца,
Ледавыя точыць путы.
Дзень даўжэе. І на сонцы
Перазвоньваюць капелі,
І махнатыя аконцы
Неўпрыкметку адпацелі.
У шумлівым разварoце
Закружылі галкі хмарай,
Палагоднеўшы ў палёце,
Дабіраюцца да пары.
Скора, скора — як ні злуйся,
А зіме здавацца трэба!
Што ж, ідзі, вясна, красуйся,
Песня сонца льецца з неба.

ВЕЛИКИЙ И МОГУЧИЙ РУССКИЙ ЯЗЫК

НА ЗЕМНОМ шаре насчитывается свыше трех тысяч языков больших и малых народностей. На некоторых из них говорят сотни людей, на других сотни миллионов. Языков с широким диапазоном распространения немного. К их числу принадлежит русский.

На русском языке созданы выдающиеся литературные произведения. В XIX — XX вв. русская литература и культура приобрели мировое значение. Русский язык стал средством общения между различными народами. Так возникли исторические предпосылки той его роли, которую он играет в настоящее время.

В XVI—XVII веках русский язык занимал в ряду других европейских языков по своей распространенности лишь шестое место после французского, немецкого, итальянского, испанского и английского. В настоящее время он занимает второе место после английского.

В свое время Фридрих Энгельс, владевший русским языком, дал ему высокую оценку. Он писал: «Знание русского языка,—языка, который всемерно заслуживает изучения и сам по себе, как один из самых сильных и самых богатых из живых языков, и ради раскрываемой им литературы, — теперь уж не такая редкость...»

Самобытность, необычайное богатство выразительных средств русского языка признаются выдающимися писателями, общественными и культурными деятелями.

Ленин считал русский язык мощным средством распространения передовых идей, богатств русской и мировой культуры; он предсказывал, что в условиях многонационального Советского государства русский язык обогатит литературу других народов и даст им возможность приобщиться к великим культурным ценностям. Эти слова оказались пророческими: русский язык стал мощным объединяющим фактором в ходе экономического, политического и культурного развития наций и народностей СССР. Он стал языком межнационального общения людей, населяющих Советский Союз. Вот почему так охотно, вполне добровольно и со все возрастающей энергией изучается русский язык. Русский язык явился выразителем новой государственности, революционных взглядов, идей мира и прогресса, стал языком передовой культуры, науки и техники.

Русский язык наряду с английским, французским, китайским и испанским, согласно Уставу Организации Объединенных Наций, признан официальным международным языком. Русская речь принята не только в стенах ООН, но и на интернациональных научных конгрессах, съездах деятелей культуры, борцов за мир, на фестивалях и всевозможных встречах молодежи, среди людей самых различных профессий, взглядов и убеждений.

С каждым годом неуклонно возрастает число стран, учебных заведений, кружков, курсов, где изучается русский язык. Например, если в 1970/71 учебном году его изучали в системе народного просвещения, в университетах, на курсах в 81 стране, то в 1973/74 учебном году, согласно прогнозам специалистов, он будет преподаваться в 87 странах.

С 1967 года существует авторитетная и деятельная международная организация —Международная ассоциация преподавателей русского языка и литературы (МАПРЯЛ), которая объединяет сейчас 97 членов из 31 страны всех континентов. В сентябре прошлого года в городе Варне (Болгария) состоялся Второй Международный конгресс этой организации, в котором участвовало около 2 000 учителей-словесников, методистов, ученых, литераторов более чем из сорока стран.

За рубежом в настоящее время насчитывается более 120 тысяч учителей школ и преподавателей вузов (иностранных граждан), которые несут русское слово людям различных стран и континентов. В помощь этим преподавателям и всем энтузиастам-распространителям знаний русского языка и созданной на нем литературы с 1967 года издается журнал «Русский язык за рубежом». Подписчиками этого журнала являются граждане 80 стран.

Велика роль русского языка в объединении многонационального населения СССР.

Русский язык, являясь равным среди равных в семье других языков СССР, стал средством межнационального общения. Выбор именно русского языка на эту роль объясняется целым рядом объективных причин, причем на первом плане оказались нужды экономического и производственного характера, а также политические, историко - революционные предпосылки и традиции и высокий уровень развития русского языка.

Здесь же надо подчеркнуть, что знание русского языка, тяга к его овладению и изучению всеми народами Советской страны ни в коей мере не означает умаления роли других национальных языков, которые в условиях братской дружбы и взаимного доверия народов, как подчеркивается в Программе КПСС, «развиваются на основе равноправия и взаимообогащения».

Федот ФИЛИН,
директор Института русского языка, член-корреспондент АН СССР.
Иван ПРОТЧЕНКО,
член-корреспондент Академии педагогических наук СССР.

ПРОДАВШИЙСЯ И ПРОСТАК

[Продолжение. Начало в №№ 8, 9, 10.]

В генеральных штабах стран капитала выстраивали колонки цифр, демонстрировавших экономический потенциал страны социализма. Таившаяся за ними реальность вызвала великое уважение, и никому из соответствующих экспертов по уже служебным соображениям не приходило в голову заявить вместе с Солженицыным, например: «Будет же кто-нибудь скоро писать и историю техники этих лет! Он даст вам все примеры и непримеры. Оценит он вам все судороги вашей припадочной пятилетки в четыре года... Узнаем, как все лучшие проекты были загублены, а исполнены худшие и худшим способом. Ну, да если хунвэйбины руководят алмазными инженерами — что из того может доброго выйти?» (стр. 386).

Если бы кто-нибудь из экспертов по СССР на Западе пошел по пути такого «анализа», он без промедления остался без куска хлеба. По очевидной причине: при планировании политики нужна правда, иначе политика эта обернется катастрофой. Но та же западная буржуазная печать, радио и телевидение с хорошо оплаченным рвением ныне говорят о нем, как чуть ли не монополисте на «правду» относительно Советского Союза. Наемные писаки, теле- и радиоврали отлично знают, что этот человек лжет, но ложь эту они силятся изобразить правдой, ибо он выполняет социальный заказ реакции — любыми средствами опорочить социализм.

К сожалению, мир многие десятилетия испытывает тяготы «холодной войны», поэтому вопрос о ее генезисе носит далеко не праздный характер. В ногу с антикоммунистическими пропагандистами диссиденты настаивают на том, что вина за прискорбное развитие событий лежит только и исключительно на Советском Союзе. В этом смысл по большому счету «Архипелага Гулаг».

Но такая точка зрения давно изгнана даже из буржуазной исторической науки на Западе. Можно с полной ответственностью утверждать, что в новейшей американской историографии взгляды, подобные высказанным Солженицыным, не получают поддержки.

Политику Советского Союза действительно оценивали примерно таким образом в Вашингтоне даже некоторые государственные деятели где-то на рубеже сороковых—пятидесятых годов. И тогда, в разгар «холодной войны», ученые возражали против такой трактовки политики СССР. «Последние,— писал Д. Ачесон, в те годы государственный секретарь США,— поставили под сомнение убеждение политических планировщиков, которое я тогда разделял, о том, что первое место в планах Кремля занимало достижение мирового господства. Они утверждали, что мы оценивали советскую политику больше в троцкистских, а не в ленинских терминах». С несогласными учеными в Вашингтоне поступили просто—их разогнали. Но, вздыхал Д. Ачесон, подытоживая этот эпизод в мемуарах, вышедших в 1969 г.: «Спустя пятнадцать лет после всего этого в науке возникла школа, утверждающая, что мы сверхпрореагировали на политику Сталина... Возможно, так и случилось в действительности».[38]

Именовавшаяся Ачесоном элегантным словом «сверхреакция» и вылилась в попытки восстановить «санитарный кордон» в Европе, что, в частности, было первопричиной берлинского кризиса. Все это ныне доказано и сверхдоказано в многочисленных трудах упоминаемой школы, в число которых входят десятки американских историков — профессора Г. Колко, А. Вильямс, Д. Флеминг. Один из видных историков этого направления Г. Алпровиц свидетельствует: «Теперь, когда открываются архивы за 1945 — 1946 гг., легко документировать трансформацию исторических целей политики США в стратегию, специально направленную на предотвращение установления контроля левых сил в Восточной Европе, спонтанного или усилиями СССР. Соединенные Штаты употребили все орудия давления из дипломатического арсенала, за исключением вооруженного вторжения, чтобы не допустить создания там левых правительств».[39] За мнимую пассивность именно в этом деле, как мы видели, поносит Солженицын Черчилля и Рузвельта.

Драгоценные концепции диссидентов рассыпаются не только при соприкосновении с фактами, но даже не соответствуют современным взглядам буржуазных историков. Они вписываются лишь в антикоммунистическую пропаганду самого низкого пошиба, рассчитанную на невежественных людей. Но это все же приобретение для реакции. Не для планирования политики (реальное значение диссидентов в правительственных ведомствах Запада хорошо известно), а для ведения «психологической войны», где обычное оружие — ложь и клевета. Поэтому их поддерживают не только проливая крокодиловы слезы по поводу судьбы «борцов» с коммунизмом, но и подачками. На счетах Солженицына в швейцарских банках по состоянию на 1973 г.— 1,5 миллиона долларов. На каждом из них, понятно, ком грязи.

ОТБРОСЫ НАУЧНО-ТЕХНИЧЕСКОГО ПРОГРЕССА

Наша эпоха научно-технической революции ставит перед человечеством и серьезные социальные задачи. Восторг перед возможностями науки и техники на Западе зачастую переходит в глубокий пессимизм, когда начинают размышлять, какие беды могут сотворить чудеса XX века в руках людей, нравственно ущербных. Как организовать общество, как интегрировать величайшие научно-технические свершения в жизнь человечества, не лишив его жизни? На этой почве расцветают различные теории «технократии», когда ставится знак равенства между знанием техники и способностью управлять обществом.

Безмерные претензии сторонников «технократии» — предмет исследования футурологов и объект постоянных насмешек подлинной научной фантастики. Один из основоположников этого жанра итальянский писатель Лино Альдани вложил в уста героя маленького рассказа «Абсолютная технократия» поучительные рассуждения:

«Стив предался размышлениям о технократии... Во время оно человеческое общество было крайне неорганизованно, на руководящие посты назначали самых неопытных, в то время как люди высокого интеллекта всю свою жизнь могли занимать весьма жалкое положение. Так во всяком случае было написано в учебниках. В двадцатом веке все еще процветал варварский строй. У власти стояли не техники-специалисты, а политиканы; эта порода людей, страдающих манией величия и излишней горячностью, исчезла с наступлением эры кибернетики и абсолютной технократии... Стив даже не понимал толком, что так ценно в этой абсолютной технократии. Он знал лишь одно — абсолютная технократия считается настоящим благом для всего человечества. Он рос в религиозном почитании социальных законов, принимая их с той же непосредственностью, с какой в детстве учатся говорить».[40]

Вымышленный человек будущего, Стив думает об этом в драматически-юмористической ситуации — при сдаче экзаменов, включающих неевклидову геометрию и теорию относительности для занятия должности подметальщика улиц второго разряда. Альдони приглашает читателей своего рассказа посмеяться над эксцессами логического завершения теорий «технократии». Действительно смешно, хотя не очень весело.

Герои нашего рассказа — люди куда как серьезные в отличие от простака Стива, они точно знают, в чем состоят блага «технократии». Правда, математик по образованию Солженицын и физик Сахаров принимают свою неосведомленность за уровень развития гуманитарных наук. Не знают они и о другом — в свое время промышленная революция породила анархизм, а научно-техническая революция также имеет свои издержки — иные никак не могут подыскать себе подобающего, по их мнению, места в обществе. Но это их не смущает. В развязном письме на имя руководителей партии и правительства от 19 марта 1970 г. Сахаров, коснувшись сложнейших вопросов общественной жизни, пытается анализировать их, по его профессиональному выражению, «в первом приближении» или оговаривая «важно, как говорят математики, доказать «теорему существования решения». Видимо, тоже метил заявить о себе.

Вооруженные столь точным и уместным методом, они строят модель идеального общества. Первый приступ к решению многотрудной задачи Солженицын сделал еще в «Августе Четырнадцатого», заставив своих положительных героев пуститься в рассуждения, как облагодетельствовать человечество, внеся должный порядок в его неустроенность. Удачливый делец Архангородский веско изрекает революционерам: «Вас — тысячи. И никто давно не работает. И спрашивать не принято. И вы — не эксплуататоры. А национальный продукт потребляете да потребляете. Мол, в революцию все окупится» (стр. 534). Сей муж, наделенный проницательностью необыкновенной, отрицает известные формы организации общества: «Не думайте, что республика — это пирог, объедение. Соберутся сто честолюбивых адвокатов — а кто ж еще говоруны? — и будут друг друга переговаривать. Сам собою народ управлять все равно никогда не будет» (стр. 536).

Начатки солженицынской азбуки, следовательно, состоят в том, что политика, политические партии—груз для человечества излишний. Промахнулись «сто честолюбивых адвокатов», а столько их и заседает в сенате США, явно промахнулись. Они, расточая средства налогоплательщиков на содержание подрывных радиостанций, засоряющих эфир злобным бредом Солженицына, не усмотрели, что он уже списал почтенных сенаторов со счетов как лиц, совершенно бесполезных. Но это их забота. Пойдем дальше.

Другой мудрец, любовно выписанный в книге и наделенный титулом инженера, добавляет: «Я считаю — Союз инженеров мог бы легко стать одной из ведущих сил России. И поважней и поплодотворней любой политической партии... Деловые умные люди не властвуют, а созидают и преображают, власть — это мертвая жаба. Но если власть будет мешать развитию страны,— ну, может, пришлось бы ее и занять» (стр. 527). Не пришлось,— в России свершилась Октябрьская революция, и в «Архипелаге Гулаг» Солженицын возвращается к этим же планам, но уже от своего имени.

Грубо фальсифицируя историю, он утверждает, что диктатура пролетариата якобы направлена против технической интеллигенции. И тут же демагогия—сознательно смешивается политическое понятие диктатуры пролетариата и конкретное руководство экономикой. Октябрьская революция открыла широчайший простор для взлета научно-технической мысли, по Солженицыну дело обстояло наоборот. «Как могли **инженеры** воспринять **диктатуру рабочих** — этих своих подсобников в промышленности, малоквалифицированных, не охватывающих ни физических, ни экономических законов производства,— но вот занявших главные столы, чтобы руководить инженерами?» (стр. 392). Где это видел Солженицын, разве в декларациях «рабочей оппозиции», бескомпромиссно

[Окончание на 6-й стр.]

[38] D. Acheson. Present at the Creation. N. Y., 1969, pp. 337, 753.
[39] G. Alprovits Cold War Essays, Garden City, 1970, p. 97.
[40] Луна двадцати рук. Сборник фантастических рассказов. Перевод с итальянского. М., 1967, стр. 52—53.

ПРОДАВШИЙСЯ И ПРОСТАК

(Окончание).

осужденных партией. Все эти нелепости не заслуживали бы внимания, если бы они не проясняли сверхидею Солженицына — в обществе должна господствовать «технократия».

Уровень интеллектуального свершения Солженицына, достигнутого посильной ему умственной работой, можно сопоставить разве с приведенными рассуждениями героя рассказа итальянского фантаста, включая текстуальное совпадение. Итак откровение Солженицына: «Почему инженерам не считать более естественным такое построение общества, когда его возглавляют те, кто могут разумно направить его деятельность? (И, обходя лишь **нравственное** руководство обществом,— разве не к этому ведет сегодня вся социальная кибернетика? Разве профессиональные политики — не чирьи на шее общества, мешающие ему свободно вращать головой и двигать руками?). И почему инженерам не иметь политических взглядов? Ведь политика — это даже не род науки, это эмпирическая область, не описываемая никаким математическим аппаратом да еще подверженная человеческому эгоизму и слепым страстям» (стр. 392—393).

Вот и докопались до сути дела, которое, как мы видели, прекрасно уместилось в крошечном сатирическом рассказе фантаста. А тут то же вещается с напыщенным видом пророка, размазывается на полотне романа в многие сотни страниц.

Коль скоро Солженицын помянул неведомую «социальную кибернетику», и тем обнаружил свою ученость, посмотрим, как относился к проблеме осчастливить математическими методами, кибернетикой и прочим общественное устройство сам Н. Винер. При известной широте взглядов, страстной приверженности к новым гипотезам основатель кибернетики твердо знал: «гуманитарные науки — убогое поприще для новых математических методов». «Нравится ли это нам или нет, но многое мы должны предоставить «ненаучному», повествовательному методу профессионального историка»[41]. В интереснейшей книге «Акционерное общество Бог и Голем» он заклинал: «Отдайте же человеку—человеческое, а вычислительной машине—машинное»[42].

Появление кибернетики в свое время свело с ума адептов «технократии» разных мастей. Задолго до Солженицына они успели выпалить все возможные доводы в пользу великого значения точных наук для общественной жизни. Такие люди «убеждены, что наша способность управлять окружающей нас материальной средой намного обогнала нашу способность управлять окружающей нас общественной средой и понимать ее. Поэтому они считают, что основная задача ближайшего будущего—распространить на области антропологии, социологии и экономики методы естественных наук с целью достижения таких же успехов в социальных областях. От убеждения в том, что это необходимо, они переходят к убеждению в том, что это возможно. Я утверждаю, что в этом отношении они обнаруживают чрезмерный оптимизм и непонимание сущности всякого научного достижения».

А чтобы пояснить свою мысль в общетеоретическом плане, Н. Винер шутливо написал: «Мы не можем придавать слишком большого значения этому направлению мыслей, подсказанному желанием. Их мысли — это мысли мышей из басни, захотевших повесить колокол на шею кошке, чтобы знать о ее приближении. Без сомнения, было бы очень приятно для нас, мышей, если бы хищные кошки мира сего носили такие колокола; но кто возьмется это сделать? Кто гарантирует нам, что власть не попадет снова в руки тех, кто больше всего жаждет ее»[43]. Винер прекрасно понимал, что водятся и злонамеренные ученые мыши. Что дело обстоит именно так, убеждает ознакомление не только с пасквилями Солженицына (с которого в области науки и спрашивать нечего), но и с маршрутами прогулок в страну Политика просвещенного академика Сахарова.

Если Солженицыну для выражения своих мыслей потребовались многие тысячи страниц, которые он с графоманским упрямством грозится дополнить еще новыми «узлами» и «частями», то академик похвально лаконичен. Брошюра в 38 страниц «Размышления о прогрессе, мирном сосуществовании и интеллектуальной свободе» вобрала без остатка все идеи Сахарова. С момента сочинения в 1968 г. академик не дополнял свое бесподобное откровение. Отправляясь в незнакомую для него страну, Сахаров, как и подобает ученому, естественно, помянул того, кто служит ему маяком,—«выдающегося» писателя А. Солженицына» (стр. 22). Почерпнув «мудрость» в этом зловонном источнике, академик понес околесицу и сущий вздор, занявшись описанием идеального, на его взгляд, общества, ибо Советское государство Сахарова не устраивает.

Он даже не стоит, а лежит на антисоветской платформе. Эпитет «позор» Сахаров без конца применяет к нашей стране[44]. Почему, собственно? Вот почему, разъясняет Сахаров, нет «демократизации» и не учитывается мнение умников (нетрудно догадаться—академика и его единомышленников). Назойливые рассуждения на эту тему играют у Сахарова ту же функциональную роль, что и разглагольствования Солженицына о нарушениях социалистической законности—это целлофановая упаковка сути его взглядов. Походя заметим — упаковка, порядком поношенная. В ней в свое время пытались всучить простакам свое кредо кадеты.

Это они именовали себя «мозгом наций» и на этом основании взывали к поддержке масс. Это они бурной осенью 1917 г. оклеили города России призывами голосовать на выборах в Учредительное собрание за список № 1 (кадетов или партии «Народной свободы»). Стандартный текст под плакатом—обращением тех времен гласил: «Партия Народной свободы всегда требовала власти народа... Партия свободы всегда выдвигала людей государственных и житейского опыта и знаний». Известно, что в России тогда прекрасно разобрались в намерениях причислявших себя к самым умным. Воззрения Сахарова, вне всякого сомнения,—рецедив кадетских взглядов, с поправкой на научно-техническую революцию. Ибо он единодушен с кадетами в главном—власть должна принадлежать капиталу.

Он требует поглощения социализма в рамках капитализма, ибо капиталистический строй якобы более совершенен. В самом деле, какая прекрасная страна — «наличие в США миллионеров не является слишком серьезным экономическим бременем в силу их малочисленности. Суммарное потребление «богачей» меньше 20 процентов, то есть меньше, чем суммарный прирост народного потребления за 5 лет. С этой точки зрения революция, которая приостанавливает экономическое развитие более чем на 5 лет, не может считаться экономически выгодным для трудящихся делом» (стр. 29).

Загвоздка одна—как же распространить великолепный строй на все человечество? На помощь, конечно, придет наука, «международная политика должна быть всецело пропитана научной методологией» (стр. 8). Нужно только покончить с малым—марксизмом, встать на позиции «реализма», и вот оно, чудо из чудес—к 2000 году на земле возникнет мировое правительство! О нем давно тоскуют все «технократы». Они пытаются записать в сторонники своей драгоценной химеры людей, ни сном ни духом не ведавших о ней. Американский физик, пресловутый «отец» заокеанской ядерной бомбы Э. Теллер с серьезнейшим видом изрек: «Я никак не могу отделаться от мысли, что президент Рузвельт мог планировать использовать атомную бомбу в качестве могучего средства в пользу мирового правительства»[45]. При жизни Рузвельта атомного оружия еще не было, а рассуждения типа Теллера, заметил американский историк проф. В. Вильямс, не поддаются проверке, ибо «обвинения, выдвинутые впоследствии, что Рузвельту следовало бы заглянуть на три месяца вперед в область ядерной физики, чистейший абсурд»[46].

Идея мирового правительства одно время овладела и великим физиком А. Эйнштейном. Когда после второй мировой войны он заговорил об этом, советские ученые сочли необходимым откровенно высказать свое мнение по поводу этого. Академики Вавилов, Иоффе, Семенов, Фрумкин в письме «О некоторых заблуждениях профессора Альберта Эйнштейна» («Новое время», 26 октября 1947 г.). В письме воздавалось должное деятельности Эйнштейна, который «неоднократно поднимал голос против гитлеровских варваров, а в послевоенный период против опасности новой войны, против стремления американских монополистов полностью подчинить себе американскую политику. Советские ученые, как и вся советская общественность, приветствуют эту деятельность ученого, движимую искренним гуманизмом».

Но разговоры о мировом правительстве, констатировали Вавилов, Иоффе, Семенов и Фрумкин, «представляются нам не только неверными, но и опасными для дела мира, за которое хочет бороться Эйнштейн». И далее объяснялось, что означает лозунг мирового правительства в современных условиях: «Лозунг наднационального сверхгосударства прикрывает громко звучащей вывеской мировое господство капиталистических монополий... Ирония судьбы привела Эйнштейна к фактической поддержке планов и устремлений злейших врагов мира и международного сотрудничества. Именно потому, что мы так высоко ценим Эйнштейна и как крупнейшего ученого, и как общественного деятеля, мы считаем своим долгом сказать это с полной откровенностью, без всяких дипломатических прикрас...»[47]. Физику Сахарову полезно бы перечитать сейчас это письмо своих старших коллег.

В самом деле, какие же блага принесет «мировое правительство» человечеству, помимо железной пяты монополистического капитала США? Очень многие, заверяет Сахаров. Сославшись на опасности «технократии», о которой упоминает Н. Винер и в книге «Кибернетика» и, помянув его книгу, открестившись от желания превращать людей «в куриц или крыс» с вживленными в мозг электродами для контроля над их поведением (стр. 20—21), Сахаров открывает именно такие перспективы перед всеми людьми. Вот как сказано, черным по белому: у мирового правительства будет множество возможностей, ибо с момента его создания «успехи биологических наук (в этот и последующие периоды) дадут возможность эффективно контролировать и направлять все жизненные процессы на биохимическом, клеточном, организационном, экологическом и социальном уровнях, от рождаемости и старения до психических процессов и наследственности включительно» (стр. 35).

Веселенькую перспективу готовят «технократы»! Вот куда выводит кадетская идеология в эпоху научно-технической революции! Мир живых роботов под бдительным оком и надзором олигархии денежного мешка. Но для этого нужны стальные нервы, по крайней мере у зачинателей бесчеловечного образа действия. Обладают ли ими диссиденты? Солженицын успокаивает, мы люди решительные. В «Архипелаге Гулаг» он заверил, что со своими единомышленниками готов на все. «Один и тот же человек, — учит Солженицын, — бывает в свои разные возрасты, в разных жизненных положениях — совсем разным человеком. То к дьяволу близко. То и к святому. А имя—не меняется, и ему мы приписываем все...

А кликнул бы Малюта Скуратов **нас**—пожалуй, и мы б не сплошали» (стр. 176).

Солженицына, человека с определенно преступной психологией, легко представить себе в этой роли, но едва ли она подходит для Сахарова. При всей нелепости его суждений они все же подходят под категорию благоглупостей «технократа» и осмеять их — достаточное воздаяние. Вероятно, ему нужно посоветовать то, что является предпосылкой любого научного поиска,—критически взглянуть на себя. Хотя бы в зеркало. Тогда многое прояснится. Наряд заплечных дел мастера, пособника Малюты Скуратова, ему определенно не к лицу.

* * *

Описанное теоретическое кредо диссидентов лежит в основе их практики—подрывной работы против Родины. Приемы и методы ее разнообразны, но превалируют в последнее время прямые обращения к руководящим кругам Запада с почтительной просьбой усилить давление на Советскую страну по всем линиям. Страдающий политической маниловщиной простак Сахаров просит конгресс США не допустить предоставления СССР режима наибольшего благоприятствования в торговле. Солженицын, конечно, злоумышленно настаивает, что деловые контакты с нашей страной—это «новый Мюнхен», и т. д. Коротко говоря, они стремятся сорвать разрядку международной напряженности, будучи уверены, что на путях «холодной войны» удастся нанести поражение социализму.

Диссиденты воюют против «коммунизма», но наносят ущерб всем нам, до последнего человека. Ибо от разрядки напряженности, расширения торговли выиграла бы каждая семья. Вот как оборачивается забота «радетелей» о народе.

Усилия диссидентов по достоинству оцениваются реакционными кругами Запада, ибо рекомендуемый им образ действия совпадает с большой стратегией антикоммунизма на современном этапе. Ученый Сахаров мог бы сделать должные выводы из этих очевидных фактов.

Империализм наращивает вооруженную мощь, военный бюджет США приближается к 100 млрд. долларов. Это неизбежно отвлекает и средства Советского государства на цели обороны. Крайние сторонники этого образа действия на Западе, который можно именовать теорией «изматывания», надеются затруднить созидательное строительство в нашей стране, вызвать определенные нехватки, что окажет свое воздействие на моральный дух советского народа.

Вероятно, под этим углом зрения они рассматривают деятельность диссидентов, смотрите, уже находятся лица, выступающие за капитуляцию перед империализмом! Здесь они усматривают обнадеживающее начало для применения изощренных методов сокрушения Советского Союза, ибо чисто военное решение вопроса не дает никаких шансов на успех.

Еще в конце пятидесятых годов в Англии вышла книга военного теоретика У. Джэксона «Семь дорог в Москву». Он дал обзор нашествий на Россию с древнейших времен, насчитал их семь и заключил:

«Вооруженные походы на нее всегда терпели неудачу, как доказали вторжения шведов, французов и немцев. Больше того, размеры катастроф прогрессивно увеличивались с каждым последующим нашествием. Единственная надежная дорога в Москву — путь викингов, давших конструктивные услуги, которые хотел и просил сам русский народ. Будем надеяться же, что никто никогда не соблазнится имитировать Карла XII, Наполеона или Гитлера, попытавшись осуществить вооруженное решение, которое, как учит история, потерпит неудачу и может повлечь за собой ядерное уничтожение человечества»[48].

К этому, в сущности, зовут диссиденты — приходите, владейте нами, мы по крайней мере поможем. Параноидный характер этих замыслов, как и самой концепции о «викингах», у нас, советских людей, сомнений не вызывает. Но работа диссидентов очень ободряет определенные круги на Западе; в великой стране якобы существуют внутренние разногласия, СССР-де колосс на глиняных ногах. Значит, наконец, достигнуто то, на что веками надеялись враги нашей страны: подорвано единство народа. Разве не учил К. Клаузевиц на примере похода Наполеона на Россию:

«Россия не такая страна, которую можно действительно завоевать, т. е. оккупировать; по крайней мере этого нельзя сделать ни силами современных европейских государств, ни теми 500 000 человек, которых для этого привел Бонапарт. Такая страна может быть побеждена лишь собственной слабостью и действием внутренних раздоров. Достигнуть же этих слабых мест политического бытия можно лишь путем потрясения, которое проникло бы до самого сердца страны... Поход 1812 г. не удался потому, что неприятельское правительство оказалось твердым, а народ остался верным и стойким, т. е. потому, что он не мог удасться»[49].

Стратеги Пентагона в обучении американского офицерского корпуса на опыте второй мировой войны постоянно цитируют это место из трудов Клаузевица, не уставая повторять: «Поймите, как дорого заплатили немцы за игнорирование этого ключевого совета Клаузевица»[50].

Деятельность диссидентов в современных условиях—явная попытка исправить промахи врагов нашей страны, приглашение проводить самый жесткий курс против Советского Союза. Солженицын и иные — грязные провокаторы, готовые способствовать даже развязыванию войны ради достижения своих бредовых антикоммунистических целей. Конечно, эти люди замахнулись на недостижимое, однако своим подстрекательством, клеветой на Советское государство они осложняют международную обстановку, подрывают упрочение мира во всем мире, ибо дают повод для проведения все новых антисоветских кампаний. Другими словами, они дают фиговый листок для прикрытия замыслов самых агрессивных кругов международной реакции.

Н. ЯКОВЛЕВ,
доктор исторических наук, профессор.

---

[41] Н. Винер. Кибернетика. М., 1967, стр. 74, 238.
[42] Н. Винер. Творец и робот. М., 1966, стр. 82—83.
[43] Н. Винер. Кибернетика. Стр. 235—236.
[44] См. подробный разбор взглядов Сахарова: «Международные отношения и идеологическая борьба». «Коммунист», 1973, № 14, стр. 16—22.
[45] E. Teller, A. Brown, The Legacy of Hiroshima, N. Y., 1962, p. 24.
[46] W. Williams. American — Russian Relations, 1781—1947, N. Y., 1952, p. 277.
[47] Л. В. Львов. Жизнь Альберта Эйнштейна. М., 1959, стр. 297—298.
[48] W. Jackson. Seven Roads to Moscow. London. 1957, p. 319.
[49] К. Клаузевиц. О войне, т. 3, М., 1932, стр. 127, 129.
[50] «The German Campaign in Russia (1940 — 1942)». Washington, 1955, p. 111.

ВЕРХНЯДЗВІНСКІЯ ЎЗОРЫ

ДЫВАНЫ, абрусы, ручнікі, сурвэткі, дарожкі... Іх шмат. І ўсе яны розныя, непаўторныя ў сваім харастве.

На светлым, добра адбеленым палатне застылі кволыя пралескі. Нібы іх толькі-толькі паклалі, і яны не паспелі яшчэ завянуць. А вось каля кветніка натапырыліся два стракатыя пеўні. Імгненне — і яны ўчэпяцца адзін у аднаго.

Па палатне часта раскіданы сняжынкі. Бялюткія, прыгожыя. Толькі вее ад іх не марозным холадам, а цяплом ласкавых, клапатлівых рук.

Не, гэта не музей, і мы не на выстаўцы. Мы ў хаце праслаўленай верхнядзвінскай мастачкі — ткачыхі мясцовай фабрыкі мастацкіх вырабаў Соф'і Пяткоўскай.

Гаспадыня, бачачы, з якой увагай разглядаюць госці яе вырабы, усміхаецца і пачынае расказваць:

— Мая маці такія прыгожыя рэчы рабіла, што я глядзела і зайздросціла. Іншы раз прасілася сесці за кросны. А маці: «Не лезь! Ты мне ўсё папсуеш!» От як яна выйдзе з хаты, дык я паціхеньку, каб жа не пачула, за кросны. Маці прыйдзе, паглядзіць і не пазнае, што я ткала. Маленькая ж была, яшчэ ледзьве даставала нагамі да панажоў. А калі я падрасла, маці сама прапаноўвала мне сесці за кросны.

Маці прала кужаль, снавала кросны, а Зося ткала. У хуткім часе пра маленькую ткачыху загаварылі ў вёсцы. Бо яна не проста добра ткала, а рабіла на палатне такія ўзоры, якіх яшчэ ніхто дагэтуль не бачыў.

Пойдуць старэйшыя дзяўчаты на луг кветкі рваць і Зоську з сабой возьмуць. Хораша ў лузе! Мядовыя кветкі стракацяць рознакаляровымі іскрынкамі, калышуцца пад ціхім павевам цёплага ветру. Стаіць Зоська, любуецца, вачэй адарваць не можа. Міжволі цягнецца да кветкі, зрывае яе, уважліва разглядае сцяблінкі і лісточкі, асобна кожны пялёстак. «А што, каб паспрабаваць выткаць такую краску на палатне? — мільгае думка. — Не адну краску, а шмат? Розных, такіх, як тут, на лузе?»

Дамоў, здавалася, не ішла, а нібы ляцела на крылах. Прыбегла ў хату, наліла ў гладыш вады, паставіла букет. На самым відным месцы паставіла. А потым абхапіла маці за шыю:

— Мамачка, каб ты ведала. Я такое сёння прыдумала! Бачыш гэты букет?

— Прыгожы.

— Дык вось, мамачка, я хачу яго выткаць.

— Выткаць?! Ты бачыш, колькі ў ім колераў і адценняў? Гэта ж кожная нітачка павінна быць на ўліку. Не ўсякі па гатоваму ўзору ткаць можа, а ты ўжо хочаш свае ўзоры рабіць?

— Я ўжо, мамачка, прыдумала. Як у лузе была. Кожную нітачку бачу. Дазволь на гэты раз мне самой аснаваць кросны. Для майго ўзору трэба, каб і аснова з каляровых нітак была.

Доўга гаманілі ў той дзень маці з дачкой, раіліся, якія ніткі трэба падабраць на аснову, якія на ўток.

— Гэта вельмі складаныя кросны. Трэба набіраць у дванаццаць нітоў, — казала маці.

— Не, мамачка, — запярэчыла Зося. — У дванаццаць нітоў марудна надта і заблытацца ў панажах можна. Лепш у чатыры ніты з пераборам на дошчачку.

Выткала Зося дыван. Усё сваё ўменне ўклала. Павесіла дыван каля свайго ложка. З таго часу і ўпрыгожвае ён кут у хаце, хоць ёсць і лепшыя, бо шмат вырабаў выткала яна, многа цудоўных узораў прыдумала.

Неўзабаве пераехала ў Верхнядзвінск.

Як перабіраліся, склалі на возе свае пажыткі, а Соф'я Уладзіславаўна і кросны моссіць.

— Куды ты гэтае староцце?.. — пытае ў яе брат.

— Няхай, можа яшчэ сатку што-небудзь прыгожае.

— Хто цяпер тчэ? Смяяцца над табой будуць. Давай спалім іх і ўсё.

Але не спалілі. І кросны ў хуткім часе спатрэбіліся.

У Верхнядзвінску Соф'я Уладзіславаўна стала працаваць на фабрыцы мастацкіх вырабаў. Там ёй далі групу маладых кемлівых дзяўчат. Вучы іх майстэрству, сказалі, перадавай свой вопыт.

Так вясковая жанчына зрабілася майстрам на прадпрыемстве. І не злічыш, колькі прыгожых дываноў ды посцілак выткала яна разам са сваімі дзяўчатамі.

— Спачатку ў нас было толькі два станкі. Потым мы пачалі ездзіць па вёсках, купляць у людзей кросны. І вось на сённяшні дзень у нас іх ужо семнаццаць.

Семнаццаць кроснаў — семнаццаць майстрых-ткачых. Вера Дудзінская, Вера Іванова, Ядвіга Ганчаронак, Галя Сялькевіч... І ўсё гэта вучаніцы Соф'і Пяткоўскай.

Яна распрацоўвае новыя ўзоры, новыя вырабы. Ручнікі з яе арнаментам экспанаваліся на рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, на міжнародных выстаўках у Фінляндыі, Балгарыі, Венгрыі, у беларускім павільёне ў Манрэалі.

Прызнанне не супакоіла Соф'ю Уладзіславаўну, а натхніла на новыя пошукі. Раней на фабрыцы ткалі дарожкі на падлогу з саломы. Вырабы атрымліваліся прыгожыя, але хутка зношваліся. Задумалася жанчына — ці нельга замяніць саломку больш трывалым матэрыялам. Аднаго разу летам была яна на беразе Дзвіны. Шапацеў зялёны чарот... Вось тое, што ёй трэба! Схадзіла дадому, узяла серп, нарэзала чароту. Спачатку дома выткала з яго сурвэтку. Панесла на фабрыку — ухвалілі. Пачалі ткаць сурвэткі, дарожкі, плесці жаночыя сумачкі.

Вырабы верхнядзвінскіх майстрых з чароту карыстаюцца вялікім попытам. Толькі ў Варшаву, у магазін «Наташа», летась адправілі дзесяць тысяч сурвэтак, вытканых з чароту.

...Вечарэе. Промні нізкага сонца падаюць на снег, і ён успыхвае залатымі крышталікамі. Соф'я Уладзіславаўна вяртаецца з фабрыкі, дзе абмяркоўваўся на мастацкім савеце яе новы ўзор, глядзіць на гэтае хараство і гадае, прыкідвае, як перадаць яго на палатне.

І. ШАЛЬМАНАЎ.



У Дзяржаўным тэатры лялек БССР рыхтуецца чарговая прэм'ера — казка Анатоля Вярцінскага «Дзякуй, вялікае дзякуй!» Ставіць спектакль малады рэжысёр, выпускніца Мінскага тэатральнага інстытута Вікторыя Казлова. Мастак — Аліна Фаміна. Зараз у рэпертуары тэатра больш за 20 спектакляў. Гэта «Чароўная галёша» і «Тыграня Петрык» — для самых маленькіх, «Званы-лебедзі» — для школьнікаў, «Мой, толькі мой» — для дарослых і многія іншыя.

НА ЗДЫМКАХ: рэжысёр В. КАЗЛОВА (справа) і акцёры тэатра на рэпетыцыі; сцэна са спектакля «Дзякуй, вялікае дзякуй!».

ПОШУКІ ПРАЦЯГВАЮЦЦА

ДА ВЫХАДУ Ў СВЕТ КНІГІ Л. ДРОБАВА «ЖЫВАПІС БЕЛАРУСІ XIX — ПАЧАТКУ XX СТ.».

Гісторыя выяўленчага мастацтва дарэвалюцыйнай Беларусі — найменш вывучаная галіна беларускага мастацтвазнаўства. Таму кніга Л. Дробава «Беларускія мастакі XIX стагоддзя», што выйшла ў свет тры гады таму назад, была сустрэта з вялікай цікавасцю (чытачы «Голасу Радзімы», напэўна, памятаюць рэцэнзію, змешчаную ў № 14 за 1972 год). У кнізе разглядалася творчасць дванаццаці мастакоў, што было толькі пачаткам у справе вывучэння гісторыі беларускага дарэвалюцыйнага жывапісу.

І вось у нашых руках новая кніга Леаніда Дробава «Жывапіс Беларусі XIX — пачатку XX ст.». Гэтае выданне намнога больш «саліднае» за папярэдняе. Ужо не 12, а больш 70 прозвішчаў мастакоў, каля 250 ілюстрацый, у тым ліку і каляровых.

У кнізе на вялікім фактычным матэрыяле паказана станаўленне розных жанраў выяўленчага мастацтва, шлях ад класіцызму да рэалізму, які прайшоў жывапіс Беларусі за ўказаны перыяд, а таксама роля Віленскай школы жывапісу, Пецярбургскай акадэміі мастацтваў і іншых навучальных устаноў у выхаванні кадраў беларускіх мастакоў.

Нялёгка было вырашыць складаныя пытанні нацыянальнай прыналежнасці мастакоў. Дарэвалюцыйны жывапіс Беларусі, на тэрыторыі якой значны час скрыжоўваўся лёс многіх народаў, вельмі цесна звязаны з мастацтвам суседніх брацкіх народаў — рускага, польскага, літоўскага, украінскага. У тых выпадках, калі дасягненні таго ці іншага мастака ў роўнай ступені належаць некалькім брацкім народам, аўтар вельмі тактоўна падыходзіць да вырашэння пытання аб прыналежнасці іх твораў да беларускай культуры. Ён робіць гэта на аснове дэталёвага вывучэння розных крыніц, у дакладнай адпаведнасці з гістарычнай праўдай. Толькі пры такім строга навуковым падыходзе можна пазбегнуць памылак буржуазных мастацтвазнаўцаў, якія, па сутнасці, адмаўлялі беларускаму народу ў яго нацыянальнай культуры.

Мы зноў сустракаем ужо вядомыя нам па папярэдняй працы прозвішчы мастакоў Я. Дамеля, І. Аляшкевіча, В. Ваньковіча, Ф. Рушчыца, І. Хруцкага, В. Дмахоўскага, К. Альхімовіча, А. Гараўскага. Звесткі пра іх значна дапоўнены і пашыраны, прадстаўлены новы ілюстрацыйны матэрыял. Але наўрад ці шырокаму чытачу вядомы такія мастакі, як Фёдар Тулаў ці Антон Главацкі, Міхаіл Кулеша ці Уладзімір Лускіна, Ян Траяноўскі ці Юльян Карчэўскі, Казімір Бахматовіч ці Леў Пігулеўскі. І хаця пра многіх з іх з-за скупасці звестак напісана толькі па некалькі радкоў, мы павінны быць удзячны аўтару ўжо за тое, што ён адшукаў гэтыя амаль забытыя прозвішчы. Цікавыя звесткі пра многіх вядомых жывапісцаў Расіі, якія доўгі час жылі і працавалі ў Беларусі. Тут з'явіліся многія творы І. Рэпіна, К. Савіцкага, І. Шышкіна, І. Пахітонава, Юльяна Фалата. Такія творчыя кантакты аказалі дадатны ўплыў на развіццё выяўленчага мастацтва Беларусі, і ў той жа час для культуры суседніх народаў гэтыя кантакты былі не менш карыснымі.

Беларускае выяўленчае мастацтва пачатку XIX стагоддзя характарызуецца ўсё больш смелым зваротам да свецкіх сюжэтаў, паступовым вызваленнем ад рэлігійнай схаластыкі. Развіваюцца партрэтны, гістарычны і бытавы жанры. Немалую ролю ў гэтым адыграў Віленскі універсітэт — галоўны ачаг распаўсюджання асветы ў Паўночна-Заходнім краі, у прыватнасці, адзін з яго факультэтаў — Віленская школа жывапісу. Яе выхаванцы першымі звярнуліся ў сваіх творах да жыцця простага народа.

Немалую ролю ў выхаванні беларускіх мастакоў адыгралі вядомыя рускія жывапісцы. Прыкладам можа служыць творчасць Івана Хруцкага. Ён увайшоў у гісторыю рускага і сусветнага мастацтва як заснавальнік класічнага нацюрморта. Але мала каму І. Хруцкі вядомы як беларускі партрэтыст. Ураджэнец мястэчка Ула на Віцебшчыне, І. Хруцкі доўгі час жыў на беларускай зямлі, дзе былі створаны яго «Партрэт жонкі з дзецьмі», «Партрэт сына».

Асаблівасцю гістарычнага жывапісу гэтага часу з'яўляецца яго ярка выражаны сацыяльны характар. На карцінах К. Альхімовіча, І. Трутнева ясна відаць, што сімпатыі аўтараў на баку галоўнага ўдзельніка паказаных тут падзей — народа.

Асабліва відавочны працэс дэмакратызацыі ў пейзажным жанры. Саладжава-сентыментальныя пейзажы з дваранскімі сядзібамі замяняюцца карцінамі сціплай беларускай прыроды. Цеплынёй і задушэўнасцю вее ад карцін «Бераг ракі Свіслач», «Вечар у Мінскай губерні», «На радзіме» А. Гараўскага, «На берагах ракі Бярэзіны» І. Гараўскага, «Від у Магілёўскай губерні» і «Дубовы гай» Н. Атрыганьева.

У жанравым жывапісу таго часу яшчэ пераважалі аднафігурныя кампазіцыі. Іх аўтары, як правіла, не ўзнімалі вялікіх сацыяльных пытанняў. Усе гэтыя тэндэнцыі добра відаць у творчасці вядомых жэнрыстаў Н. Сілівановіча, П. Баркоўскага, І. Аскназія, В. Дмахоўскага і інш. Аднак лепшыя іх творы не толькі праўдзіва адлюстроўвалі многія бакі жыцця беларускага народа, але і абуджалі думкі і пачуцці сучаснікаў, заклікалі іх да актыўных дзеянняў.

Партрэтны жывапіс прадстаўлены прозвішчамі такіх мастакоў, як Б. Русецкі, А. Ромер, Э. Паўловіч, Р. Слізень, Л. Пігулеўскі. Гэтыя мастакі імкнуліся перадаваць не толькі знешнія рысы сваіх герояў, але і іх сацыяльную прыналежнасць. У партрэтным жывапісу з'яўляецца вобраз працаўніка.

У пачатку XX стагоддзя ў Беларусі актывізуецца грамадскае і культурнае жыццё. Расце колькасць беларускіх мастакоў. Усё часцей арганізоўваюцца мастацкія выстаўкі ў Мінску і іншых гарадах. На старонках друку нярэдка разгортвалася вострая палеміка паміж прыхільнікамі рэалістычнага мастацтва і фармалістамі. Рэвалюцыйныя падзеі 1905 года выклікалі з'яўленне такога аператыўнага сродка выражэння, як графіка. Многа і паспяхова працуюць графікі С. Богуш-Сестржанцэвіч, А. Каменскі, І. Яроменка, К. Кастравіцкі. Паглыбляюцца сацыяльныя матывы ў бытавым жанры.

Вялікі ўплыў на творчасць беларускіх жывапісцаў аказалі рускія мастакі-перадзвіжнікі. Серыю цікавых кампазіцыйных партрэтаў стварыў у Здраўневе пад Віцебскам вялікі рускі жывапісец І. Рэпін. Па рэпінскаму шляху пайшлі многія беларускія мастакі — Ф. Рушчыц, Г. Вайсенгоф, Я. Гругер, Ю. Пэн, С. Жукоўскі, В. Бялыніцкі-Біруля. Некаторыя з іх дажылі да савецкага часу і з'явіліся носьбітамі тых прагрэсіўных тэндэнцый у рэалістычным мастацтве, пад уплывам якіх у далейшым развівалася мастацтва сацыялістычнага рэалізму.

Увесь разгледжаны ў кнізе матэрыял відавочна паказвае, што, развіваючыся ў цесным узаемадзеянні з мастацтвам рускага, польскага і літоўскага народаў, беларускі жывапіс ніколі не губляў сваёй самабытнасці, што рэалістычны жывапіс Беларусі вядзе сваё існаванне не з пачатку XX стагоддзя, як з прычыны недастатковага вывучэння сцвярджалі некаторыя мастацтвазнаўцы, а значна раней.

Аўтару выдання прыйшлося пераадолець нямала цяжкасцей. Многія палотны па розных прычынах апынуліся за рубяжом, месцазнаходжанне некаторых наогул невядома, і ў лепшых выпадках захаваліся рэпрадукцыі ў старых выданнях. Біяграфічныя звесткі пра многіх мастакоў у розных крыніцах пададзены даволі павярхоўна і тэндэнцыйна. Давялося шмат папрацаваць у бібліятэках і музеях Мінска, Масквы, Ленінграда, Вільнюса, Варшавы, Кракава і іншых гарадоў.

Леанід Дробаў не спыняе работу над гісторыяй беларускага выяўленчага мастацтва, як дарэвалюцыйнага, так і савецкага часу. Рыхтуецца да друку новая кніга мастацтвазнаўцы—«Жывапіс Савецкай Беларусі», якая з'явіцца працягам разгледжанага намі выдання.

Яўген САХУТА.

Удзельніцы народнага ансамбля песні і танца Мінскага палаца піянераў і школьнікаў.
Фота К. ЯКУБОВІЧА.

МУЗЫЧНЫ ТЫДЗЕНЬ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Штогод, у пачатку першага месяца вясны, праводзіцца вялікае музычнае свята — Усесаюзны тыдзень музыкі для дзяцей і юнацтва. Сёлета месцам яго правядзення была абрана Беларусь. 1 сакавіка ў памяшканні Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР адбылося ўрачыстае адкрыццё Тыдня.

На працягу сямі дзён лепшыя канцэртныя і тэатральныя сцэны, палацы і дамы культуры рэспублікі былі аддадзены дзецям — паўнапраўным гаспадарам свята, выканаўцам і слухачам. Юныя музыканты, спевакі, танцоры выступалі перад сваімі равеснікамі ў дзіцячых садах і школах, прафесійна-тэхнічных вучылішчах. Сярод выканаўцаў — хор хлопчыкаў і ансамбль скрыпачоў сярэдняй спецыяльнай музычнай школы пры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, ансамбль песні і танца Мінскага палаца піянераў, ансамбль цымбалістаў музычнай школы № 2 і Мінскага музычнага вучылішча, удзельнікі народнага ансамбля танца «Равеснік» і дзіцячай народнай балетнай студыі «Мара», дзіцячы народны хор Мінскага аўтазавода і шмат іншых вядомых дзіцячых калектываў.

У госці да беларускіх школьнікаў прыехалі сябры з Украіны, Расіі, Літвы, Латвіі, Туркменіі, Азербайджана, Малдавіі, Кіргізіі. Незабыўныя ўражанні і ў дарослых, і ў маленькіх слухачоў пакінуў канцэрт хору хлопчыкаў «Ажуолюкас» («Дубок») з Вільнюса.

У час Тыдня было шмат цікавых сустрэч школьнікаў з кампазітарамі, артыстамі, музыкантамі. Беларускія кампазітары напісалі нямала твораў для дзяцей і юнацтва. Гэта — гераічная опера Р. Пукста «Марынка» і опера-казка А. Янчанкі «Мыйдадзір», кантата для дзіцячага хору Р. Суруса «Упарты Фама» і кантата-гімн, прысвечаная Марату Казею, «Усім піянерам равеснік і брат» У. Алоўнікава, сімфанічныя творы Г. Вагнера і Д. Смольскага, інструментальныя канцэрты П. Падкавырава і Д. Камінскага, песні Ю. Семянякі, І. Кузняцова, У. Алоўнікава, І. Лучанка. У дні свята адбыліся дзве музычныя прэм'еры: упершыню былі выкананы араторыя Я. Глебава «Падарожжа ў краіну дзяцінства» і «Фартэпіянныя цыклы для дзяцей» Г. Вагнера.

Тыдзень музыкі для дзяцей і юнацтва ў святочнай форме прадэманстраваў плён сістэматычнай і паслядоўнай дзейнасці, якая мае на мэце далучыць дзяцей і моладзь да хараства мастацтва, навучыць іх слухаць і разумець музыку. Гэтую думку падкрэсліў госць Тыдня лаўрэат Ленінскай прэміі кампазітар Дзмітрый Кабалеўскі, адзначаючы важнасць такога цікавага і карыснага мерапрыемства.

А. МАЛАШЭЎСКАЯ.

КІТАБЫ

Займаючыся краязнаўствам, я шмат вандраваў па Беларусі. Народныя паданні, успаміны старых людзей дапаўнялі і рабілі больш цікавымі гістарычныя падзеі.

Аднойчы ў Відзах я застаўся начаваць у Сымона Асадчанкі. Неўзабаве да яго зайшоў сусед Якуб Лявонавіч. Размова зайшла пра гістарычныя помнікі Браслаўшчыны, і мае субяседнікі згадалі пра старую драўляную мячэць ля татарскіх могілак. Я выказаў жаданне пагутарыць з кім-небудзь з нашчадкаў тых татар, што некалькі пасяліліся ў Відзах. Гаспадар дома рассмяяўся:

— Ды вось мой сусед і ёсць татарын!

Толькі чорнымі, як смоль, густымі валасамі Якуб Лявонавіч выдзяляўся сярод нас. Ён расказваў пра сваіх продкаў, пра Відзы, а я прыгадваў татарскія пасяленні ў Мінску, Капылі, Пінску...

— Не раз даводзілася мне чуць ад дзеда, а той чуў яшчэ ад свайго дзеда, гісторыю нашага перасялення з Крыма. Было гэта ў пачатку пятнаццатага стагоддзя... Літоўскі князь Вітаўт, не маючы іншых саюзнікаў, прапанаваў татарам выступіць супраць польскага караля.

На гэты раз да вялікай вайны не дайшло. Спалілі некалькі мястэчак, напалохалі каралеўскае войска, тым справы і скончыліся. Князь Вітаўт быў прызнаны гаспадаром — вялікім князем усёй Літвы. Ён папрасіў татарскага цемніка пасяліць коннікаў у мястэчках для вайсковай службы.

Татар жанілі з мясцовымі дзяўчатамі. З таго часу ў некаторых захаваліся двайныя прозвішчы, як, напрыклад, Бут-Гусаінаў. Плакалі красуні, не хацелі выходзіць замуж за «нехрышчоных татарскіх разбойнікаў». Ды воля князя была законам. Князь шчодра плаціў наёмнікам. Не шкадаваў золата, надзяляў зямлёй.

Спачатку татарскія коннікі спраўна неслі службу ў атрадах гвардыі князя. Па меры заняпаду Вялікага княства Літоўскага татары пачалі займацца гандлем і саматужніцтвам — выраблялі скуры. У гэтым яны былі выдатныя майстры. Вядома, рэлігія адмяжоўвала іх ад мясцовых людзей, і трымаліся яны адасоблена. Але час рабіў сваё, татары паступова асіміляваліся, страцілі сваю мову, набылі мясцовыя імёны. У касцёл або царкву, праўда, не пайшлі, маліліся ў мячэці, чыталі каран.

— А вы бачылі каран? Які ён? — пытаю я.

— Каран — кніжка, па-арабску — кітаб або аль-кітаб, — тлумачыць Якуб Лявонавіч. — Гэта не вельмі тоўстыя на выгляд, пажоўклыя ад часу кніжкі з пергаментных лістоў. Кітабы напісаны арабскім пісьмом, але вось што цікава: над кожным арабскім радком у мясцовых кітабах ёсць адпаведны тэкст з беларускіх слоў, напісаных таксама арабскай вяззю.

Гэта мяне вельмі зацікавіла. Звычайна караны-кітабы пісалі на арабскай мове, хаця яна чужая татарам. Магчыма, у далёкую даўніну кітабы пісаліся і на арабска-татарскай мове. Сваю мову тутэйшыя татары з цягам часу забыліся і пачалі размаўляць на беларускай. Вось тады, пэўна, мулы, якія дужа рупіліся аб рэлігіі, і напісалі кітабы на арабскай і беларускай мовах.

— А як арабскае пісьмо перадае гучанне беларускай мовы? Вы самі чыталі кітабы? — пытаюся я.

— Чытаць па-арабску не ўмею, — разводзіць рукамі Якуб Лявонавіч, — але не раз чуў, як старыя чыталі. У дзяцінстве мяне вучылі па кітабе быць пакорным алаху. Там напісаны не толькі малітвы, але і бытавыя апавяданні. Беларуская мова пры чытанні гучыць вельмі хораша. Захоўваецца дзеканне, цеканне, аканне...

Пры наступнай сустрэчы ён паклаў на стол вялікую зашмальцаваную кнігу. Хутчэй гэта асобныя пажоўклыя лісты, сшытыя нейкай жылай.

Бяру кітаб у рукі. Мясцінамі жыла амаль перацерлася. Лісты пергаменту рудыя па краях, белыя на сярэдзіне. Усе старонкі густа спісаны складаным перапляценнем розных ліній, кропак, завітушак. Загалоўкі выдзелены больш вялікім і тлустым напісаннем. Перад загалоўкамі малюнкі: паўмесяц, лук і стрэлы, крывыя татарскія шаблі.

Унізе некаторыя лісты ад пальцаў пры гартанні амаль працерліся і прасвечваюцца наскрозь. Ніяк не магу разгледзець малюнкі на вокладцы — пацерлася з часам.

Я яшчэ доўга разглядаў старую, як сама гісторыя, і такую незвычайную на нашай зямлі кніжку-кітаб, або аль-кітаб, напісаную арабскім пісьмом на беларускай мове.

...Пазней я даведаўся, што ў Мінску, у бібліятэцы Акадэміі навук БССР імя Якуба Коласа, захоўваюцца два рукапісныя кітабы.

Г. ЛАНЕЎСКІ.

Тоўсты лёд на возеры крыху пацямнеў, паволі паддаецца веснавому сонцу. І рыбакі спяшаюцца прыхапіць апошнія дні падлёднага лову, бо ёсць у гэтым і свая адметнасць, і прывабнасць.

Амаль нерухома сядзяць над лункамі аматары — яны не столькі «здабываюць» рыбу, (хаця на юшку мае кожны), як атрымліваюць асалоду ад наваколля, нейкай рыбацкай садружнасці, ад набліжэння вясны.

А вось на Нарачы з'яўляецца санны абоз. Брыгада мясцовага рыбгаса спускае пад лёд трохсотметровы невад. Немалое ўмельства і сілы патрэбны для такой работы. Пакідалі свае вуды і лункі аматары. Цікава паглядзець, што трапіць у невад. Чырванню і срэбрам адліваюць на сонцы акуні, плоткі, шчупакі, якіх перагружаюць з невада ў сані. Гэтую рыбу гаспадыні «зловяць» свежай у спецыялізаваных магазінах.

Фота А. ГЛІНСКАГА.

РОБЯЦЬ ФІНСКІЯ КАРАБЕЛЫ

«Беларусь» — сучаснае аўтапасажырскае судна. Яно пакуль што не баразніць моры і акіяны. «Беларусь» будуюць па заказу Савецкага Саюза карабелы Фінляндыі.

Вось некаторыя даныя, якія характарызуюць гэты акіянскі лайнер. Даўжыня яго — 150 метраў, вышыня бартоў каля 20 метраў, скорасць больш 21 вузла. «Беларусь» будзе прымаць адразу тысячу пасажыраў.

Для паслуг тых, хто захоча зрабіць падарожжа на новым цеплаходзе, — два плавальныя басейны (для дарослых і дзяцей), бібліятэка, дзве цырульні, гандлёвы цэнтр, музычны салон, два рэстараны.

СКРЫПКА МАДЖЫНІ

Дзяржаўная калекцыя унікальных смычковых інструментаў Беларусі папоўнілася скрыпкай вядомага італьянскага майстра Маджыні, які жыў у канцы XVI—пачатку XVII стагоддзя.

Як устанавіла экспертная камісія, інструмент выраблен каля 400 год назад, аднак гучыць ён па-ранейшаму цудоўна. Пасля рэстаўрацыі на скрыпцы будуць іграць лепшыя выхаванцы кансерваторыі.

ГУМАР

Знаёмы — галівудскай кінаэрцы:

— Ведаеш, я, на жаль, не змагу прыйсці да цябе на вяселле.

— Не засмучайся, хутка будзе наступнае.

●

— Мамачка, можна мне скупацца ў моры цяпер? — пытаецца маленькая Жазефіна.

— Ні ў якім разе, дзіцятка. Хвалі занадта вялікія!

— Але ж татачка купаецца.

— Татачка застрахаваны.

●

Псіхіятр:

— Дык вы гаворыце, што плаціце падаткі з радасцю? І калі гэта ў вас пачалося?

●

Эрыксан прыйшоў дамоў позна і добра падпіўшы. Каля дома ён убачыў, што згубіў ключ ад парадных дзвярэй. Ён кінуў каменьчык ў акно спальні і, калі разбуджаная жонка выглянула ў акно, крыкнуў, каб яна кінула яму ключ, што яна і зрабіла. Аднак прайшло пайгадзіны, а Эрыксана ўсё не было ў хаце. Тады жонка зноў выглянула ў акно і спытала:

— Можа, ты хочаш, каб разам з ключом я табе кінула яшчэ і замочную шчыліну?

●

— Адзін дацкі турыст у Мадрыдзе хацеў заказаць у рэстаране біфштэкс са смажанымі шампіньёнамі. Але ён зусім не ўмеў гаварыць па-іспанску.

— І якое ж выйсце ён знайшоў?

— Вельмі проста. Ён намаляваў грыб і быка.

— І яго зразумелі?

— Амаль. Афіцыянт прынёс яму зонцік і білет на карыду.

●

У адным паўднёвым штаце, дзе існаваў сухі закон, два прыезджыя спыталі мясцовага жыхара, дзе яны могуць штонебудзь выпіць.

— У гэтым горадзе віскі служыць сродкам супраць укусаў змяі, — сказаў той. — Тут толькі адна змяя, і паспяшайцеся заняць чаргу, пакуль яна не стамілася.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-07-82, 33-65-84, 33-03-15, 33-65-91, 33-15-15.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. № 366.